ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г.
№ 32 (1106) 10 жніўня 2013 г. Кошт 4 500 рублёў.

КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА

ПАЛЁТЫ Ў КІНО І НАЯВЕ

На здымачнай пляцоўцы новай карціны для дзіцячай аўдыторыі ад Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" і сапраўды шмат неверагоднага. Балазе працоўная назва — акурат **"Неверагоднае перамяшчэнне"**. Тут былі палёты, чароўныя з'яўленні, незвычайныя персанажы і шмат чаго цікавага. Фотарэпартаж са здымак — у гэтым нумары.

С. 3


Фота Аляксандра ДЗМІТРЫЕВА

Артысты Генадзь Фамін і Дзмітрый Есяневіч апрабавалі "палётныя тэхналогіі" ў здымачным павільёне "Неверагоднага перамяшчэння".

Рэакцыя на рэдакцыю: **каментарыі да нашых артыкулаў з Сеціва**
С. 4 — 5

Культура **дрэс-кода**
С. 5

Беларуская **сцяна перад "новай драмай"**: працягваем дыскусію
С. 7

Якога ж "рангу" зоркі гастралююць у нас?
С. 3

Нестандартна: **хто ўцёк з Эльсінора?**
С. 8

УВАГА! / ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" / ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ІНДЭКС — 63875 ВЕДАМАСНЫ ІНДЭКС — 638752

А гібеюць не толькі вёскі...

Калі дзейнасць сельскага клуба **мала каго цікавіць...**

Неяк так атрымалася, што менавіта на прыкладзе Віцебшчыны мы пераканаліся: дэмаграфічная праблема для Беларусі — адна з самых надзённых. Ведалі пра гэта і да нашага аўтапрабегу. Скажам, даваеннае насельніцтва Дуброўна дасягала ці не сарака тысяч чалавек — цяпер жа тут жыве толькі дзесяць... Аднак працяг вандроўкі па Ушацкім раёне пераканаў: праз знікненне жыхароў гібеюць не толькі "бясстатусныя" вёскі, але нават і асобныя аграгарадкі. Натуральна, усё гэта не можа не адбіцца на стабільнасці працы ўстаноў культуры. Інакш кажучы, брэнды ёсць (адны азёры чаго вартыя!) — ды толькі прыросту насельніцтва не стае...

С. 10 — 11



ЗНОЙДЗЕНЫ "ФЭЙСБУК" ЖЫГІМОНТА II

С. 14

Праект

Выратаваныя каштоўнасці

"Выратаваныя каштоўнасці" — такая ўнікальная выстаўка адкрылася ў Нацыянальным гістарычным музеі Беларусі. Яна арганізавана сумесна з філіялам Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея — музеем "Выратаваныя мастацкія каштоўнасці". Гэта адзіны ў Беларусі і на тэрыторыі СНД музей, дзе знаходзяцца творы мастацтва і антыкварыяту, канфіскаваныя пры спробе незаконнага вывазу іх за мяжу.

У экспазіцыі прадстаўлены больш за 300 помнікаў гісторыі і культуры, твораў выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, якім пашанцавала вярнуцца з нябыту. Яна складаецца з помнікаў нумізматыкі і баністыкі XV — XX стст., прадметаў з каштоўных металаў, а таксама твораў мастацтва краін Усходу і Заходняй Еўропы. Вельмі цікавая частка экспазіцыі — калекцыя рускіх абразоў XVIII — XX стст. Дапаўняюць выстаўку творы сакральнага мастацтва — узоры растоўскай фініфці, рускага меднага ліцця і рарытэтныя кніжныя выданні.

Упершыню!

"Хаўз" для Тызенгаўза

12 — 15 верасня ў Гродне ўпершыню пройдзе Свята класічнай музыкі "TyzenHouse". Фестываль праводзіцца пры падтрымцы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, а яго галоўным арганізатарам выступае Гродзенскі аблвыканкам.

Усе чатыры канцэрты пройдуць у зале Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра. Назва фестывалю іскрыцца гульнёй слоў і пры жаданні можа быць перакладзена як "Дом Тызенгаўза". Праграма ж прывабіць нават самых спакушаных меламанаў, бо ўсе выканаўцы — сусветна вядомыя зоркі найвышэйшага рангу.

Так, у вечар адкрыцця слухачоў чакае сустрэча са знакамітым піяністам Барысам Петрушанскім. Адзін з апошніх вучняў легендарнага Генрыха Нейгаўза, апошнім часам ён жыве і выкладае ў Італіі, працягваючы канцэртную дзейнасць па ўсім свеце. 14 верасня сольны канцэрт дасць прызнаны польскі піяніст Пётр Палечны, неаспрэчны (і вельмі нечаканы, папраўдзе "крэатыўны") інтэрпрэтатар твораў Ф.Шапэна.

Яшчэ ў двух канцэртах месца за раялем зойме 25-гадовы беларускі музыкант Кірыла Кядук — ураджэнец Гродна, лаўрэат найпрэстыжных міжнародных конкурсаў, які прадоўжыў адукацыю ў Польшчы і Італіі, а зараз жыве ў Германіі ды шырока гастралюе па ўсёй Еўропе і не толькі. Менавіта ён паўтара года таму выступіў ініцыятарам правядзення дадзенага форуму ў сваім родным горадзе, запрасіўшы тых музыкантаў, з якімі цесна супрацоўнічае. 13 верасня ён выступіць разам з маладым скрыпачом Міхаілам Сіманянам, якога ўжо на пачатку кар'еры пачалі называць новым Давідам Ойстрахам. А 15-га — з Дзяржаўным камерным аркестрам Беларусі, за пульт якога ўстане малады польскі дырыжор Якуб Храновіч.

На тым жа канцэрце закрыцця свята з гэтым калектывам будзе саліраваць і наш віяланчэліст, лаўрэат Міжнароднага конкурсу імя П.Чайкоўскага, удзельнік перадапошняга класічнага "Еўрабачання" Іван Карызна.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Інтэрв'ю з мастацкім кіраўніком "TyzenHouse" Кірылам Кядукам чытайце ў адным з наступных нумароў "К".

Арт-прысвячэнне

"Па слядах Шагала ў Ізраілі"

Пад такой назвай 8 жніўня ў Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага ў Мінску адкрылася перасоўная выстаўка пры ўдзеле Ізраільскага культурнага цэнтра пры Пасольстве Дзяржавы Ізраіль у Рэспубліцы Беларусь, Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Іосіфа Шагала, прадстаўнікоў яўрэйскіх суполак Беларусі, акадэмічнай і творчай грамадскасці.

Марк Шагал наведваў Ізраіль восем разоў, пісаў свае ўражанні ад Тэль-Авіва, Іерусаліма, Цфата ды іншых мясцін Біблейскай зямлі. Тут ён стварыў вітражы ў сінагозе ў Іерусаліме, мазаікі і габелены для Кнесета, мноства эскізаў для работы над ілюстрацыямі да Бібліі.

У экспазіцыі прадстаўлены аўтарскія копіі (жыкле на палатне) работ Аб'яднання мастакоў Ізраіля: гэта своеасаблівы дыялог сучаснага ізраільскага мастака і Маэстра. Глядач пабачыць 30 твораў мастакоў розных мастацкіх школ і кірункаў. Сярод іх ёсць і тыя, хто нарадзіўся і вучыўся ў Беларусі: Л.Мінковіч, А.Жудро, Б.Караванаў, І.Хініч, Г.Няпомняшчы.

Кожны ўдзельнік выстаўкі перадае сваё ўспрыняцце духоўнай спадчыны М.Шагала і свой погляд на дзень сённяшні праз прызму часу.

А 9 жніўня ў Нацыянальным гістарычным музеі Беларусі адкрылася выстаўка "Пад знакам меноры. З гісторыі яўрэйства ў Беларусі", прысвечаная 90-годдзю дзеючага Прэзідэнта Дзяржавы Ізраіль Шымона Перэса і 100-годдзю з дня нараджэння былога Прэм'ер-міністра Ізраіля Менахема Бегіна.

Менавіта зямля беларуская стала месцам, дзе нарадзіліся гэтыя вядомыя дзеячы. Фотаматэрыялы, прывезеныя з Ізраіля, пазнаёмяць з іх біяграфіямі, а арыгінальныя рэчы яўрэйскага побыту, рытуальныя прадметы з калекцый Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі і Музея гісторыі і культуры яўрэяў Беларусі дапамогуць адчуць атмасферу яўрэйскага мястэчка першай трэці XX стагоддзя.

Экспазіцыя створана пры падтрымцы Пасольства Дзяржавы Ізраіль у Рэспубліцы Беларусь і Музея гісторыі і культуры яўрэяў Беларусі.

Фестываль

"Анімаёўка-2013": 170 стужак з 26 краін

Культурная сталіца Беларусі і СНД — горад Магілёў вырашыў сёлета не абмінуць увагай і свята анімацыі. З 16 па 18 верасня ў горадзе на Дняпры пройдзе XVI Міжнародны фестываль анімацыйных фільмаў "Анімаёўка".

— На дадзены момант на ўдзел у фестывалі даслана больш за 160 стужак, — паведаміла карэспандэнту "К" начальнік аддзела метадычнай працы магілёўскага "Кінавідэапракату" Жанна Чэпялінская. — Геаграфія ўдзельнікаў сур'ёзная: 26 краін. Прычым мы ўпершыню атрымалі заяўкі ад аніматараў з Малдовы, Таджыкістана, Кыргызстана, Кубы, Славакіі і Чылі…

Папулярнасцю карыстаецца конкурс дзіцячай анімацыі "Я не чараўнік, я толькі вучуся…", на які сёлета паступіла больш за 60 стужак з 7 краін. Калі ўлічыць, што дадзены конкурс ладзіцца на "Анімаёўцы" толькі ў трэці раз, то можна павіншаваць арганізатараў фэсту з удалым "ноўхау", які "набірае абароты" ўвагі.

— У спаборніцтве прыме ўдзел і мультфільм, зроблены дзецьмі нашай магілёўскай студыі, — нагадала

Жанна Чэпялінская пра адкрытую сёлета пры гарадскім "Кінавідэапракаце" секцыю анімацыйнай творчасці. — Такім чынам, для нас фаварыт, за якога мы будзем "хварэць", ужо вызначаны…

Вядома, што новая студыя ў Магілёве зараз працуе на базе двух кінатэатраў — "Космас" і "Ветразь", — і яе навучэнцамі з'яўляюцца больш за 30 чалавек.

Традыцыйна ў праграму форуму ўключаны і конкурс выяўленчага мастацтва і дэкаратыўна-прыкладной творчасці. Цяпер колькасць работ, дасланых на яго, набліжаецца да 400.

Урачыстае адкрыццё "Анімаёўкі", як заўжды, адбудзецца ў кінатэатры "Радзіма", зазначае спецыяліст. Але папярэднічаць яму будзе тэатралізаванае шэсце па вуліцы Ленінскай, кульмінацыяй якога стане шпацыр па "чырвонай дарожцы" на Плошчы Зор гасцей і ўдзельнікаў форуму.

Дарэчы, сёлета адным з самых чаканых гасцей фестывалю стане Людміла Гнілава — савецкая і расійская актрыса тэатра, кіно і дубляжу, заслужаная артыстка РСФСР. Вядучай жа цырымоніі адкрыцця "Анімаёўкі-2013" будзе яшчэ адна актрыса з суседняй дзяржавы — заслужаная артыстка Расіі Аксана Сташэнка. Летась ейнае з'яўленне на магілёўскім фестывалі зрабіла сапраўдны фурор: дзеці літаральна "разрывалі" актрысу на аўтографы.

Склад журы фэсту пакуль захоўваецца ў таямніцы, але раскрыць яе арганізатары абяцаюць у самы бліжэйшы час, таксама як і распавесці пра колькасць тэматычных праграм фестывалю, што вызначыць напрыканцы месяца селекцыйная камісія.

— Пакуль мы дакладна можам казаць толькі аб праграме нашай студыі "Беларусьфільм", якая абавязкова будзе прадстаўлена ў рамках "Анімаёўкі", — трымае інтрыгу супрацоўнік "Кінавідэапракату".

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ

Культурны твітар: мы ў свеце

А трохтысячная "...Бяседа" — на дзесяць гадзін!

Германія

У культурным цэнтры раёна Хелерсдорф Берліна адбылася вечарына "Беларусь — зямля пад белымі крыламі", арганізаваная Пасольствам Беларусі ў ФРГ сумесна з таварыствам "Берлінскае культурнае кола". Асноўным пунктам праграмы стала выступленне дуэта ў складзе цымбаліста Міхаіла Лявончыка і гітарыста Яна Скрыгана. Сцэна і зала былі ўпрыгожаны габеленамі выдатных майстрых з секцыі мастацкага тэкстылю Беларускага саюза мастакоў. Удзельнікі мерапрыемства прагледзелі прэзентацыйны відэаролік "Беларусь: адзін дзень з жыцця" і мультыплікацыйны фільм Міхаіла Тумелі "Выцінанка-выразанка".

8 жніўня ў Германска-Расійскім музеі "Берлін-Карлсхорст" (Музеі капітуляцыі) адбыліся мерапрыемствы, прымеркаваныя да 70-годдзя Хатынскай трагедыі.

Адкрылася выстаўка "Хатынь — святыня нацыянальнай памяці", падрыхтаваная Дзяржаўным мемарыяльным комплексам "Хатынь" пры падтрымцы шэрагу архіўных устаноў Беларусі. Адбылася таксама панэльная дыскусія на тэму "Спаленыя вёскі: Хатынь 1943 — падзея і памяць пра яе ў Рэспубліцы Беларусь", арганізаваная Пасольствам Беларусі ў ФРГ сумесна з музеем "Берлін-Карлсхорст".

Дырэктар Дзяржаўнага мемарыяльнага комплексу "Хатынь" Артур Зельскі і нямецкі гісторык беларускага паходжання Алена Тэмпер пазнаёмілі аўдыторыю з гісторыяй Хатынскай трагедыі і Мемарыяльнага комплексу "Хатынь", адказалі на шматлікія пытанні па такіх тэмах, як культура памяці пра Вялікую Айчынную вайну ў сучаснай Беларусі, шляхі пашырэння ў Германіі інфармаванасці аб злачынствах, здзейсненых акупантамі на беларускай зямлі.

Польшча

З жніўня ў гміне Міхалова Падляшскага ваяводства Польшчы адбыўся Трэці Фестываль беларускай культуры "Прымацкая бяседа". Мерапрыемства было арганізавана Гарадской управай горада Міхалова, Гмінным цэнтрам культуры і Беларускім грамадска-культурным таварыствам у Польшчы пры падтрымцы з боку Пасольства Беларусі ў Польшчы і Міністэрства культуры нашай краіны. Традыцыйны ўдзел у мерапрыемстве ў Міхалове прыняла дэлегацыя з Ваўкавыска — горада-пабраціма з Беларусі, — на чале са старшынёй райвыканкама Міхаілам Сіцько.

Удзельнікамі фестывалю сталі звыш 300 выканаўцаў з ліку прадстаўнікоў аматарскіх калектываў беларускай меншасці ў Польшчы. Свята, якое доўжылася каля дзесяці гадзін, сабрала амаль тры тысячы гледачоў. Хараство фестывалю надалі выступленні калектываў з Беларусі: Беларускага дзяржаўнага заслужанага харэаграфічнага ансамбля "Харошкі", ансамбля народнай музыкі "Бяседа", ансамбля "Неруш" з БДУ, эстраднага вакальнага ансамбля "Раскоша" Гродзенскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў.

На здымку: ансамбль "Прымакі" пад час фестывалю "Прымацкая бяседа".

Фота Юрыя ЧАРНЯКЕВІЧА

Фотасюжэт нумара

"Неверагоднае перамяшчэнне"

На здымках новай стужкі "Беларусьфільма" для дзіцячай аўдыторыі пад назвай "Неверагоднае перамяшчэнне" пабываў Аляксандр ДЗМІТРЫЕЎ.

Трэба абмеркаваць!

Тыдзень таму "К" згадала выступленне ў "Мінск-Арэне" знакамітага брытанскага гурта "Depeche Mode". І задалася пытаннем: чаму замежныя зоркі так рэдка завітваюць да нас менавіта на піку сваёй кар'еры? На жаль, куды часцей яны прыязджаюць, калі іхняя папулярнасць на Захадзе і нават у суседняй Расіі ўжо знікае ці нават знікла.

Чаму да нас так рэдка завітваюць **зоркі з сусветнымі імёнамі?**

Зміцер БЕЗКАРАВАЙНЫ, журналіст, музычны крытык, прадзюсар:

— Канцэрты сталых, але актуальных артыстаў, такіх як "Depeche Mode", Mylene Farmer, Moby, "Nickelback", "Placebo", Jennifer Lopez, а таксама маладых зорак Lana Del Ray, Selena Gomez, "Hurts", Adam Lambert, сведчаць, што ў апошнія два-тры гады сітуацыя змяняецца да лепшага. Канцэртны рынак актывізаваўся і чакаць дзесяць — дваццаць гадоў прыезду любімай сусветнай зоркі ці ехаць на яе канцэрт за мяжу ўжо не будзе патрэбы. На мой погляд, на сітуацыю паўплывала з'яўленне "Мінск-Арэны": пляцоўкі з такой умяшчальнасцю раней не хапала, каб рабіць мэтазгодным прыезд вялікіх зорак. Другі момант — на якасна іншы ўзровень выйшлі мясцовыя арганізатары канцэртаў. Запрашэнне зорак такога кшталту не адбываецца адразу — трэба спачатку атрымаць давер міжнародных прамоўтараў, папрацаваць з імі па менш папулярных артыстах з менш складанымі тэхнічнымі і побытавымі патрабаваннямі. Некалькі беларускіх прамоўтараў гэтыя "экзамены" паспяхова прайшлі, таму "калібр" зорак, што прыязджаюць у Беларусь, будзе толькі расці. Пры гэтым рынак залежыць і ад фінансавых магчымасцей публікі: яны маюць пэўныя абмежаванні. Мяркуючы па шчыльным графіку канцэртаў у Мінску на восень, "канкурэнцыя" за грошы гледачоў будзе толькі расці...

Уладзімір КУБЫШКІН, прадзюсар:

— Зорак да нас прыязджае столькі, колькі пацягнуць кішэні беларускіх гледачоў. І тое, што апошнім часам больш стала выступаць сусветных імёнаў, не можа не радаваць. Але, для параўнання, у Лондане — звыш 50 канцэртных залаў умяшчальнасцю ад трох тысяч чалавек і больш, бо на гэта ёсць попыт. Што ж да нас, дык галоўнае тут — існуе станоўчая тэндэнцыя, арганізатары не баяцца рызыкаваць. І тое, што на гэтым рынку сёння, па маіх падліках, прысутнічае каля пяці "гульцоў", якія канкурыруюць паміж сабой, — дадатковае таму сведчанне. Ну а далей можна прагназаваць, што чым больш сусветных зорак будзе прыязджаць, тым хутчэй сыйдзе нізкаякасны прадукт. Патрабаванні Еўропы і свету — гэта жывое выкананне, прычым не пад "мінус", а з жывым складам музыкантаў. Калі гэта стане нормай, дык будуць "падцягвацца" і астатнія. Дый беларускім артыстам будзе на што арыентавацца.

Але ж звярну ўвагу яшчэ на адзін аспект. Ёсць паняцце "рэгіёна" — у высокім сэнсе гэтага слова. Дык вось, Мінск, Кіеў, Масква, Вільнюс, Варшава і г.д. — гэта рэгіён Усходняй Еўропы. І калі канцэрт такіх зорак, як Мадонна, Лэдзі Гага ці "Metallica", ладзіцца ў адным з гарадоў, дык гледачы з'язджаюцца з рэгіёна. Сам штораз бачыў сотні беларусаў у падобных ваяжах! Калі будзе спрошчаны візавы рэжым на такія мерапрыемствы, дык і падобнага культурнага турызму, вельмі распаўсюджанага ў свеце, стане больш. І не толькі мы будзем ехаць кудысьці ў замежжа, але і іншаземныя гледачы — да нас…

Будзем на сувязі!

Паважаныя чытачы! Нам цікавае ваша меркаванне па тэмах нумара.
Пішыце на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77, альбо на электронную скрыню kultura@tut.by,
тэлефануйце ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97, **абмяркоўвайце** на
www.facebook.com/kimpressby, www.vk.com/kimpressby, www.twitter.com/kultura_by!

Вяртаючыся да надрукаванага

Варыянт: "гастрольная" галерэя

Пасля публікацыі "Ці патрэбна мастацкая галерэя ў аграгарадку?" у рэдакцыю завітаў наш сталы чытач, дырэктар Колкаўскага СДК Петрыкаўскага раёна Мікалай ГЛУШКО. Вось якімі развагамі ён падзяліўся па названай тэме.

— Як работнік культуры з немалым досведам ведаю ўсю паднаготную жыцця ў вёсцы і магчымыя накірункі. Маё меркаванне такое: адкрыццё мастацкіх галерэй у аграгарадках і вёсках — справа, безумоўна, добрая, але — неперспектыўная. Урэшце, і патэнцыйным гледачам пакуль не да гэтага.

Яўген Рагін правільна зазначыў у сваёй рэпліцы наконт рэнтабельнасці падобных устаноў культуры. А ўявіце сабе яшчэ платныя білеты! Такая галерэя — прынамсі, пакуль — асаблівым попытам карыстацца не будзе. Гэта па-першае. Па-другое, нават у райцэнтрах у нас часцяком няма сталай карціннай галерэі ці хаця б большменш прыстасаванай выставачнай залы. У нашым раёне часцей аматары выстаўляюцца. А вось каб з Гомеля прадастаўлялі на экспанаванне частку калекцыі?

Адзіны варыянт развіцця падобнай ідэі — праводзіць выстаўкі не на пастаяннай аснове, а пад "патранатам" нейкага буйнога, скажам, абласнога, мерапрыемства. А таксама выстаўкі сучасных "перасоўнікаў", экспазіцыі па выніках лакальных пленэраў, паказы, прымеркаваныя да тых жа святаў вёсак. Але і ў такім выпадку неабходна патлумачыць людзям, чаму за сузіранне твораў мастацтва трэба плаціць, няхай і сімвалічную суму.

На сітуацыю са стаўленнем да культурных мерапрыемстваў уплывае і дэмаграфія, і наяўнасць у вёсках, аграгарадках дамоў культуры, музычных ці мастацкіх школ. Выдатна, што ў аграгарадках суседзяў (Акцябрскага, Калінкавіцкага раёнаў) здолелі адкрыць музычныя класы, сабраць туды спецыялістаў. Хаця, зразумела, перспектывы асаблівай няма, бо вёска там — 400 чалавек. Наша — большая. І ўсё ж, як бачыце, нават у меншых вёсках знайшлі штаты ды зрабілі справу.

Калі казаць шырэй, дык чаму ў вёсках у нас няма асаблівага культурнага прагрэсу? Бо мы варымся ва ўласным соку. Таму такая выязная выстаўка, хаця б раз на паўгода, можа і павінна быць: спачатку яна ў раён прыбыла, а потым па вёсках паехала. Урэшце, ужо нават паказ у райцэнтры ўзрадаваў бы…

Дзяжурны па нумары

Не ўсё заканчваецца "інтэрмедыяй"

Надзея БУНЦЭВІЧ,
рэдактар аддзела газеты "Культура"

Калі тэатр пачынаецца з вешалкі, а працягваецца ў зале, дык завяршаецца — пэўна, ізноў вешалкай, па законах трохчасткавай формы? Буфет жа, пры такім раскладзе, становіцца "інтэрмедыяй". Праўда, бываюць выпадкі, калі буфетам усё і заканчваецца, бо менавіта тут некаторыя гледачы праводзяць другую дзею спектакля.

Не, я не пра чыпсы ў глядзельнай зале (усё ж тэатраў яны датычацца менш, чым кінатэатраў). Я — пра пост-тэатральнае баўленне часу, пра той "працяг банкета", які мог бы лагічна перанесціся ў тэатральнае кафэ і спалучыцца з абмеркаваннем толькі што ўбачанага. Ці — пра такія тэатральныя праекты, дзе спалучаліся б столікі і сцэна.

Многія памятаюць, што ў далёкія савецкія часы побач з нашым Вялікім тэатрам, на рагу вуліц М.Багдановіча і А.Пашкевіч, было кафэ "Тэатральнае". Пасля спектакляў туды часцяком завітвалі артысты — і, адпаведна, іх прыхільнікі, што садзейнічала "змычцы" тэатра з інтэлігенцыяй. Музыканты, мастакі, літаратары збіраліся ў так званым "Мутным воку" — кавярні ў Доме мастацтваў, побач з Цэнтральным Домам афіцэраў (потым гэты будынак быў вернуты царкве). Менавіта тут разгортваліся самыя вострыя дыскусіі, наладжваліся творчыя кантакты — віравала мастацкае жыццё. Дый на тэлебачанні нас спакушалі "Шынком "13 крэслаў",

Часы перабудовы і эканамічныя цяжкасці адвучылі інтэлігенцыю ад наведвання падобных "пажыўных месцаў". Але памятаю, як яшчэ ў 1990-я, калі Беларускі саюз кампазітараў змяшчаўся па старым адрасе — на плошчы Свабоды, — былі прапановы рэаніміраваць "Музычныя серады" — паказы новай музыкі з далейшым абмеркаваннем — менавіта ў такім фармаце: за столікамі з кубачкам кавы. Ні ў якім разе не рэстаран, дзе музычная праграма — у дадатак да ежы, а ўсё наадварот! Сёння традыцыі вяртаюцца: пабываўшы ў замежжы, тая ж моладзь разумее, што кавярні прызначаны не толькі для вяселляў-юбілеяў. Але ж ці вяртаюцца ў кавярні тэатралы? І ці імкнуцца самі тэатры рушыць у бок "братання" з буфетам?

> Не, я не пра чыпсы ў глядзельнай зале. Я — пра пост-тэатральнае баўленне часу, у тым ліку і з акцёрамі ды рэжысёрамі пастановак.

Станоўчы прыклад сумесных імпрэз ёсць хіба ў Брэсцкім акадэмічным тэатры драмы, пры якім існуе драм-рок-клуб — у бары "На тэатральнай". У Мінску той жа "Гаспадар кавярні" П.Пражко паказваўся ў мінскім пабклубе "Графіці". Няўжо ж больш нідзе няма такіх магчымасцей? Якраз наадварот. Аднойчы была сведкай таго, як гледачы, спазняючыся ў Тэатр беларускай драматургіі і адным махам адолеўшы прыступкі перад тэатрам, знянацку кінуліся ў дзверы... кавярні. Яно і не дзіва, бо кафэ месціцца пад дахам тэатра. А ў час спектакляў там адкрываюць унутраныя дзверы, каб гледачы маглі туды трапіць замест буфета. Дый само кафэ рэкламуе сябе як месца, дзе "вы можаце сустрэць любімых акцёраў". Праўда, цэны там зусім не адпавядаюць акцёрскім заробкам. І ніякіх сумесных праектаў я не памятаю. Такія ж магчымасці — у Вялікім тэатры оперы і балета: акрамя некалькіх буфетаў у фае партэра ды бельэтажа, там ёсць і службовы ўваход, дзверы ў які адчыняюцца таксама з вуліцы.

Чаму б не выкарыстоўваць гэтыя магчымасці? У такіх кавярнях можна ладзіць прэзентацыю прэм'еры, абмеркаванне спектакля... Адна з ідэй, дарэчы, напалову рэалізавана — дастаткова ўзгадаць "Местачковае кабарэ" М.Пінігіна ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы. Спектакль ідзе на сцэне, але ў глядзельнай зале так і хочацца замест радоў крэслаў паставіць столікі. Дадам, што менавіта такую рэарганізацыю залы задумаў і Вячаслаў Палунін, наглядзеўшыся замежных тэндэнцый і ўзначаліўшы ў Санкт-Пецярбургу цырк. З цыркам, мо і перабор, бо знішчаць дзеля гэтага арэну наўрад ці мэтазгодна. Але навошта рабіць выбар між апрабаваным традыцыйным — і чымсьці новым (а апошняе, як неаднойчы заўважана, з'яўляецца забытым старым)? Ці не лепш спалучыць?

Тым больш, што гледачы, не чакаючы рашэнняў, самі навучыліся "спалучаць" тое, што ім трэба. У тым жа Вялікім тэатры часцяком бачыла гэткія "карпаратывы", калі пасля першай дзеі дружная кампанія "перасяляецца" ў буфет і застаецца там на ўсю другую дзею. Уцяміла магчымасці супрацоўніцтва і кіраўніцтва. Сталічны кінатэатр "Кастрычнік", Новы драматычны тэатр ды іншыя ўстановы пачалі ладзіць акцыі: маўляў, прад'яўляеш білеты — атрымліваеш скідку ў бліжэйшай "ядальні".

Але ж справа не толькі ў фінансах! У рэшце рэшт, гэткія "кавярня-музычна-тэатральныя" прагляды-пасяджэнні маглі б мець самы розны кірунак — не толькі ўласна забаўляльны, але і асветніцкі, папулярызатарскі, нават крытычны. Бо ў такой форме можна праводзіць "эксклюзіўна закрытыя" абмеркаванні ўбачанага — маўляў, толькі для наведвальнікаў і спектакля, і кавярні. Ладзіць іх трэба, вядома, з удзелам артыстаў, а магчыма, і з далейшай справаздачай на сайце тэатра, што прыцягне новую аўдыторыю. Калі так, дык з часам непрыкметна, без залішняга націску і маралізатарства, мы выхаваем і таго дасведчанага гледача, пра якога ўсё мараць.

З наскоку ж

Палілог перад фестывалем: няўжо нашы тэатры **пачалі адчуваць канкурэнцыю?**

Увосень мінчан і гасцей сталіцы чакае III Міжнародны форум тэатральнага мастацтва "ТэАРТ". Каб падрыхтаваць да гэтай падзеі культурную грамадскасць, арганізатары распачалі серыю "круглых сталоў", прысвечаных найбольш актуальным праблемам тэатральна-фестывальнага руху, і назвалі іх "Тэатральныя сустрэчы з "ТэАРТ". У ліпені адны з вядучых крытыкаў Беларусі і Расіі — галоўны рэдактар часопіса "Мастацтва" Людміла Грамыка і эксперт "Залатой Маскі" Дзмітрый Рэнанскі — разам з дырэктарам форуму "ТэАРТ" Анжалікай Крашэўскай, мастацтвазнаўцам Аляксеем Стрэльнікавым, які выступіў мадэратарам праекта, і зацікаўленымі абмеркавалі тэатральны фестываль як феномен сучаснай культуры.

Нашто нам фестываль?

Са з'яўленнем "ТэАРТа" ўсё часцей сталі раздавацца і супрацьлеглыя думкі: маўляў, навошта нам усё гэта, калі ёсць сваё? І хаця пакуль такія меркаванні выказваюцца выключна ў кулуарах, зрабіць выгляд, што мы іх не чуем і не ведаем, было б памылкова. Тым больш, што гучаць яны не з боку гледачоў, а ў самім тэатральным асяродку. І гэта, у рэшце рэшт, першы доказ таго, што "ТэАРТ" — на правільным шляху, бо нашы тэатры пачалі адчуваць канкурэнцыю, хваляваца за свайго гледача, які атрымае цяпер магчымасць параўноўваць — і часта не на карысць тых тэатраў, на сцэнах якіх ідуць фестывальныя паказы. У нас звычайна робяць інакш, свядома запрашаючы гасцей, на парадак слабейшых за нашых, каб негалоснае спаборніцтва нязменна атрымлівалася з вялізнай перавагай гаспадароў. Дык ці здольны фестываль, у такім выпадку, зрушыць гэтую сітуацыю? Ці ён можа толькі раздражніць апетыты ды спустошыць кішэні публікі, якая потым адмовіцца ад айчыннага тэатральнага фаст-фуда?

Як адзначыў Дзмітрый Рэнанскі, такое стаўленне да фестывальнага руху ўласціва ўсёй постсавецкай прасторы; у Расіі таксама не адразу і не ўсе пачалі ўспрымаць новыя тэндэнцыі. Але фестывалі фарміруюць і гледачоў, і самі кадры, найперш — рэжысёраў у іх прафесійным станаўленні.

Людміла Грамыка прывяла прыклады "Белай вежы" ў Брэсце і "М.@rt.кантакту" ў Магілёве: "Назіраючы за імі, можна адзначыць, што не толькі публіцы, але і самім тэатральным дзеячам гэтых гарадоў фестывалі даюць глыток свежага паветра, які не дазваляе заставацца на кансерватыўных пазіцыях. "ТэАРТ" з самага пачатку быў арыентаваны на перадавыя сусветныя знаходкі і змог пераадолець супраціўленне тэатральнай грамадскасці Беларусі. Калі спачатку, сутыкнуўшыся з новымі кірункамі, хтосьці парываў: маўляў, мы і самі з тымі ж другакурснікамі можам не горш, — дык цяпер ужо зразумела, што вось так адразу, з наскоку, — не атрымаецца.

Але што радуе больш за ўсё, дык гэта стаўленне публікі. Памятаю, як усе хваляваліся, ці ўспрыме яна таго ж Касцялучы, якога і ў прасунутай Еўропе прызнаюць далёка не ўсе. Пасля спектакля планавалася абмеркаванне, яго нават хацелі перанесці ў іншую залу, каб было ўтульней. Ажно не: публіка спектакль прыняла, на абмеркаванне засталася практычна ўся зала, прычым людзі задавалі адэкватныя пытанні, што здзівіла нават саміх стваральнікаў пастаноўкі, якія прывыклі да таго, што частка публікі выступае супраць. Адкрыццём для грамадскасці сталі і няпростыя для ўспрыняцця спектаклі Каршуноваса. Таму, калі я чую заклікі "Давайце любіць сваё!", вельмі хочацца адказаць: мы свой тэатр ужо "залюбілі да смерці" — давайце глядзець, што адбываецца ў свеце! Без фестывальнага руху мы існуём у замкнёнай прасторы".

Фестываль, дадаў Рэнанскі, стварае сітуацыю дыялога культуры, праз які павінна адбывацца згуртаванне нацыі. Мы ж, са свайго боку, удакладнім: галоўнае, каб гэта не было "з'яднанне супраць агульнага ворага" — тых замежных пастановак, якія лепшыя за нашы.

Крытыкаваць ці фарміраваць?

Закранулі на "круглым стале" і пытанне суадносін фестываляў і крытыкаў. Не, размова не ішла пра тое, ці пускаць апошніх на фестываль (як ні дзіўна, але на некаторых форумах, здараецца, такія праблемы ўзнікаюць), — разглядаліся самі формы супрацоўніцтва крытыкаў з фестывалем.

А яны могуць быць, як адзначыла Людміла Грамыка, самымі рознымі. Гэта і стасункі з гасцямі, і ўдзел у абмеркаваннях, і публікацыі у СМІ. Але галоўная праблема тут у тым, што колькасць крытыкаў, здольных ацаніць спектаклі, зменшылася. Тэатральны працэс асвятляецца слаба. Замест сур'ёзнага аналізу з'яўляюцца анонсы, пераказы, фотарэпартажы. Такое становішча склалася яшчэ і таму, што тэатральная суполка, бывае, і сама не зацікаўлена ў прафесійным крытычным падыходзе: усе чакаюць адно ўхвалення, рэкламы, каб тая паўплывала на продаж білетаў, і не больш.

Была абмеркавана роля крытыкаў у фарміраванні праграм. Узгадаем, што арганізацыйныя недасканаласці гэтага працэсу, якія перашкаджаюць тэатразнаўцам уздзейнічаць больш уплывова, неаднаразова ўзнімаліся і на "круглых сталах" па выніках Нацыянальнай тэатральнай прэміі. Дзмітрый Рэнанскі прывёў прыклад расійскіх фестываляў, што не запрашаюць крытыкаў да адбору спектакляў, і гэта негатыўна адбіваецца на ўзроўні: "Крытыкі сталі мадэратарамі фестываляў не ад добрага жыцця — проста, яны зразумелі, што трэба браць усё ў свае рукі, каб высокім быў сам імідж фестываляў". Такое супрацоўніцтва, дарэчы, ідзе на карысць абодвум бакам. Арганізатары ведаюць, што не дарма выдаткоўваюць грошы, што пры ўдзеле крытыкаў высокамастацкі вынік — забяспечаны.

Ад праблем нікуды не падзецца

Зразумела, што адной з галоўных праблем на ўсіх фестывалях становіцца фінансавы складнік. Калі форум абмежаваны ў грошах, дык не ўсё можа паказаць, што хацелася б. Другі не менш важкі бок, таксама звязаны з фінансамі, — гатоўнасць гледачоў набыць білеты, часта нятанныя. Нарэшце, трэцяя дэталь — фінансаванне фестывальных спектакляў саміх гаспадароў.

Дзмітрый Рэнанскі лічыць, што, у параўнанні з замежжам, у нас усё не так дрэнна, як здаецца: "Сітуацыя ў

Рэакцыя на рэдакцыю: якія артыкулы газеты

Да матэрыялу "Вырак на адзіноту. Інтэлектуальную" № 26

Юрый:
"Спадару Чарановічу — рэспект! Пабольш бы такіх людзей, краязнаўцаў, адданых родным мясцінам, у кожным мястэчку Беларусі..."

Да матэрыялу "Беларусы замежжа: як вам там жывецца?" № 28

Valentina Yakimovich:
"Падзяліліся і беларусы Нью-Ёрка. Сумна, калі свае змагаюцца са сваімі. Нішчаць самых адданых ды працавітых... Старанна ўсё раструшчаць, абы сваё імя напрыканцы жыцця пакінуць у гісторыі эміграцыі. Ім, відаць, не важна, што ад гэтага прайграюць усе".

Да матэрыялу "Якія плюсы і мінусы ўваходжання "Белвідэацэнтра" ў структуру "Беларусьфільма"?" № 29

Alla Bobkova:
"На маю думку, трэба, наадварот, рабіць больш малых кінаструктур, бо яны значна больш мабільныя і больш самастойныя ў творчым пошуку ды і ў камерцыйным плане. "Белвідэацэнтр" за апошнія два гады тое прадэманстраваў. Калісьці рэфарматары з Беларускага саюза кінематаграфістаў прапанавалі Міністэрству культуры стварыць у складзе "Беларусьфільма" самастойныя студыі, а кінафабрыку вылучыць асобна. Па гэтай схеме працаваў кінаканцэрн "Мосфильм", які застаецца дзяржаўным прадпрыемствам (праўда, як сцвярджаў генеральны дырэктар Карэн Шахназараў, ён не меў дзяржаўных датацый). Калі б у нас думалі пра кінастратэгію, то ішлі б гэтым шляхам".

не атрымаецца!

"Сёння дзеячы сцэны ў большасці сваёй займаюць утрыманскую пазіцыю, разбурана рэжысёрская школа. Не дзіва, што дыскусіі зводзяцца ці да праблем фінансавання, ці да абмеркавання, колькі камедый можа прысутнічаць у рэпертуары, каб гэта не парушыла тэатр".

Еўропе — куды горшая, бо там знайсці грошы на новыя фестывальныя пастаноўкі насамрэч цяжэй. І рэжысёры дамаўляюцца адразу з некалькімі фестывалямі, тыя скідваюцца, і на гэтыя грошы ставіцца спектакль, які потым будзе катацца па азначаных форумах".

Гэта пацвердзіла і Людміла Грамыка: "У Еўропе 80 працэнтаў на пастаноўку шукаюць самі, а максімум 20 — дае дзяржава. У нас жа — усё наадварот: галоўная падтрымка — дзяржаўная".

Што ж да саміх фестываляў, дык у Расіі з імі таксама праблем хапае. Акрамя "Залатой Маскі", скіраванай на расійскія пастаноўкі, у Маскве ёсць і Міжнародны тэатральны фестываль імя А.П. Чэхава, куды прывозілі ўсё лепшае, што было ў Еўропе. Ішоў апошні па тры месяцы. Але з часам ягоны фармат змяніўся: зараз ён доўжыцца максімум паўтара месяца, а галоўнае — скіраваны на самаакупнасць, таму ў ім пачалі пераважаць цыркавыя, харэаграфічныя прадстаўленні, разлічаныя на шырокую публіку. А што да фестывалю "NET", які расшыфроўваецца як "Новы Еўрапейскі Тэатр", дык усе жартуюць, што назва — няўдалая, бо грошай катастрафічна няма: маўляў, як карабель назавеш...

Што ж да публікі, дык, лічу, была б добрая афіша, а глядач падцягнецца, асабліва калі з ім працаваць, даказваючы, што спектакль неабходна ўбачыць абавязкова! У Расіі — іншая праблема: надта шмат усяго прывозіцца, і папраўдзе публіка, якой многа і за межамі сталіцы, літаральна не паспявае ўсё ахапіць. З Новасібірска да Масквы так хутка не даедзеш, а ў вас — можна даехаць на мінскі спектакль з любога абласнога цэнтра. Тое ж, што ў Польшчы: у Варшаву публіка едзе і з іншых гарадоў".

Аляксей Стрэльнікаў заўважыў, што тэатральны турызм у нас не развіты. Тым не менш, ужо ёсць прыклады, калі спецыялісты едуць глядзець прэм'еру ў іншы горад. А ўлічваючы, што ў Еўропе тэндэнцыя пачала складацца толькі пасля Другой сусветнай вайны і сфарміравалася не так даўно, дык ёсць спадзеў, што і ў нас яна стане больш распаўсюджанай.

Дык зрабіце хоць што-небудзь!

Лозунгам тэатраў, на думку Дзмітрыя Рэнанскага, павінна стаць прыказка "Выратаванне тапельцаў — справа рук саміх тапельцаў". Ён прывёў прыклады таго, як рэжысёры ставілі спектаклі на кватэрах, на плошчах, не маючы датацый, арганізоўвалі тэатр са спектаклямі на арэндных пляцоўках, хаця ў Санкт-Пецярбургу, у адрозненне ад Масквы, знайсці сцэну практычна немагчыма: "Найперш — творчае выказванне, грошы — потым. Мяркую, іншага шляху няма".

Людміла Грамыка ўзгадала, як віраваў тэатральны працэс у сярэдзіне 1990-х, калі адкрываліся студыі: "Сёння дзеячы сцэны ў большасці сваёй займаюць утрыманскую пазіцыю, разбурана рэжысёрская школа. Не дзіва, што дыскусіі зводзяцца ці да праблем фінансавання, ці да абмеркавання, колькі камедый можа прысутнічаць у рэпертуары, каб гэта не парушыла тэатр. Сітуацыя — складаная. З аднаго боку, раздаецца "вечны плач": нам не даюць, мы не іграем!.. З іншага ж, малыя сцэны ў многіх тэатрах бяздзейнічаюць. Нават Акадэмія мастацтваў. Так, там рамонт, але раней, яшчэ да яго пачатку, сцэна навучальнага тэатра часам пуставала".

Беларусы мы, беларусы!

Нацыянальныя пастаноўкі, як высветлілася, хвалююць не толькі нас — на многіх замежных фэстах часта менавіта яны становяцца галоўным стрыжнем. У Германіі клапоцяцца пра нямецкамоўныя пастаноўкі, у Францыі — пра франкамоўныя. Такое ж становішча — і ў іншых еўрапейскіх краінах. Што да беларускай драматургіі, дык уражанне, што пра маладых творцаў, якія працуюць у нязвыклым яшчэ для нас кірунку "новай драмы", дбаюць, найперш, нашы суседзі — Расія і Польшча. "Павел Пражко, — запэўніў Дзмітрый Рэнанскі, — той малады рускамоўны драматург, якога ставяць часцей за іншых. Між маскоўскімі тэатрамі ідзе ледзь не спаборніцтва, хто будзе яго ставіць, расійскія драматургі нават скардзяцца, што на іх забыліся. На рускамоўным фестывалі ў Польшчы чатыры спектаклі з дзясяткі былі паводле п'ес Пражко; ягонай творчасці ў фестывальным буклеце прысвяцілі 35 старонак з сотні... Мне расказвалі, як у Польшчы хтосьці зайшоў на сайт Купалаўскага тэатра, каб падлічыць, колькі ж ставяць Пражко на радзіме, і не мог паверыць вачам, не знайшоўшы нічога. А ёсць жа яшчэ Сцешак, Багаслаўскі. Пры гэтым у саміх п'есах — шмат беларускіх рэалій, не зразумелых замежнікам. Таму пастаноўкі атрымліваюць хіба агульнаэстэтычнае ўспрыняцце, не могуць быць рэалізаваны цалкам, з усёй сваёй глыбінёй. Вельмі важна, каб мастацтва паказвалася там, дзе яно ўзрасло. З беларускай жа драматургіяй атрымліваецца ўсё наадварот. А між тым, самае сучаснае, што сёння ёсць у беларускім тэатры, — гэта драматургія. І яе неабходна вярнуць на беларускую прастору".

Як заўважыла Анжаліка Крашэўская, "перашкаджае стаўленне: пабудуйце дом, а мы падумаем, што там будзем рабіць. Масквічы, якія засвойваюць беларускую драматургію, пачынаюць самі".

"На беларускія тэатры, — лічыць Аляксей Стрэльнікаў, — можа паўплываць хіба грамадская думка. Напісалі ў свой час, што Табакоў разгледзеў п'есу Курэйчыка — і ўсе ў нас пачалі таксама звяртацца да ягонай творчасці. Раннія творы Пражко былі пераймальнымі. Але іх не ставілі, і ён пачаў развівацца далей".

"Многія беларускія п'есы, — прадоўжыла Людміла Грамыка, — прыходзяць на Беларусь праз Маскву, — так было нават з Дударавым. Курэйчык жа сам сябе прасоўвае, робячы геніяльны піяр. А Масква заўсёды прагне новага, таму няма нічога дзіўнага ў тым, што нашых драматургаў адкрываюць там. У нас таксама пастаўлены некаторыя п'есы Пражко. Але як толькі тая ж Кацярына Аверкава сказала сваёй пастаноўкай "Не!" крыналінам, на "М.@rt.кантакце" ледзь не скандал разгарэўся, бо хтосьці сказаў: маўляў, які жах! Асабіста я вельмі прыдзірліва шукала ў п'есах Пражко нешта такое, з-за чаго іх ставіць было б нельга. І нічога, што трэба было б забараніць, не знайшла: там такога няма".

■■■

А між тым, на самім "круглым стале", нягледзячы на вялікае кола разгледжаных праблем, пытанняў не паменшала. Урэшце, падобныя сустрэчы маюць стаць традыцыяй не толькі на фэсце "ТэАРТ", але і на ўсіх буйных форумах са статусам "міжнародны". Дый нацыянальным фестывалям дыскусіі не зашкодзілі б.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Чарговую дыскусію пра "новую драму" на беларускай сцэне чытайце на стар. 7.

На маю думку...

Пра дрэс-код і Мадонну

Алег ЧЭЧАНЕЎ,
акцёр, рэжысёр Мінскага абласнога драматычнага тэатра

Сацыяльныя сеткі стракацяць групамі, прысвечанымі гораду Маладзечна. Колькасць падпісчыкаў перавальвае за тысячу і больш, паколькі згуртаванні даволі падрабязна і аператыўна асвятляюць падзеі, што адбываюцца ў горадзе ды раёне. Праглядаючы навіны, я натрапіў на фотарэпартаж, дзе глядач, крок за крокам, сфатаграфаваў выступленні маладых зорак беларускай эстрады з нагоды Дня горада, здаецца.

Разглядаючы ўборы выканаўцаў, згадаў азначэнне "дрэс-код". Гэта значыць, што ў адным і тым жа смокінгу нельга ісці на прыём у пасольства, загараць на пляжы, стаяць з каляскай ля касы ці збіраць каларадскіх жукоў на бульбяным полі.

Вось возьмем хлопцаў з гурта "Litesound". Іх можна паважаць за волю і характар, праяўленыя ў імкненні адстаяць сваё права выступіць на конкурсе "Еўрабачанне" ў 2012 годзе. Сваю частку святочнага канцэрта яны адпрацавалі ў немудрагелістых пацёртых джынсах і футболках. Пасля выступлення музыканты гурта, не пакутуючы на зорную хваробу, з задавальненнем фатаграфаваліся з усімі ахвотнымі, раздавалі аўтографы — усё ў тых жа футболках і джынсах. Я ўявіў сабе, як яны садзяцца ў машыну, едуць у Мінск, дзе расслабляюцца ва ўтульным кафэ, абмяркоўваюць мінулы дзень ды раз'язджаюцца па дамах. Усё ў тых жа футболках і джынсах. З хлопцамі ўсё зразумела: яны не надта задумваюцца наконт свайго іміджа. Іхні пасыл у глядацкую залу вельмі просты: мы нічым не выдзяляемся з натоўпу, мы такія ж, як і вы — маладыя ды энергічныя. Галоўнае, каб не знікаў адрэналін і не пераводзіліся прыхільніцы.

А вось з дзяўчатамі больш складана. "Чаго бракуе нашым выканаўцам?" — такое пытанне ўзнікла пры праглядзе канцэртных фота дзяўчат з гурта "Bucity". Ува мне загаварыў голас гісторыка моды Аляксандра Васільева: "Аблягаючыя шорцікі — гэта добра для фітнес-клуба ці трэнажорнай залы. Гэта той жа дрэс-код". Не вядома, каму прыйшла ў галаву ідэя пашыць якраз такія ж з бліскучай тканіны (так і напрошваецца: "Але з перламутравымі гузікамі") ды апрануць у іх выканаўцаў. Адчуваецца, што на мэце было падкрэсліць зграбнасць маладых фігур, а на выхадзе атрымалася пародыя на баксёрскія шорты... Мне скажуць: маўляў, хопіць бурчаць, асабіста яны ні ў чым не вінаваты. Дам адказ: а як жа ўнутраны густ кожнай?

> Мне яшчэ могуць запярэчыць: гэта наш эпатаж! Мадонне вунь усё можна — чаму ж нам нельга? Адкажу: Мадонна — гэта добра прадуманы бізнес-праект.

Мне запярэчаць: гэта наш эпатаж! Мадонне вунь усё можна — чаму ж нам нельга? Адкажу: Мадонна — гэта добра прадуманы бізнес-праект. У гэтым бізнесе працуюць сотні людзей, якія падкідваюць спявачцы новыя ідэі ды прадумваюць кожны ейны жэст і рух. Дзякуючы гэтаму яна і трымаецца на плаву не адно дзесяцігоддзе. І ў гусце, і ў пачуцці стылю ёй не адмовіш. Таленавіты акцёр, вывучыўшы тэкст ролі, зліваецца са сваім персанажам у адно цэлае, становіцца цалкам іншым чалавекам і — забывае пра свайго персанажа, ледзь толькі сціхаюць апладысменты залы. Тое ж самае, на мой погляд, можна сказаць і пра Мадонну.

Сцэна — гэта не начны клуб, дзе пануе іншая атмасфера і зусім іншая ступень раскаванасці публікі. Сцэна паказвае і раскрывае ўзровень ды ступень творчых здольнасцей — як выканацаў, так і тых, хто рыхтуе іх выступленні: стылістаў, візажыстаў ды іншых. Што выканаўца хоча паказаць сваім прыхільнікам, чаму навучыць, не жадаючы таго? Гледача можна эпацiраваць колькі заўгодна. Толькі — з густам, каб не ўзнікала адчування няёмкасці ад таго, што адбываецца, каб глядач не адводзіў вочы ад сцэны. Каб, нарэшце, не сачыняць адказ на наіўнае пытанне дзіцяці, якога бацькі ўзялі на канцэрт: чаму гэтыя дзядзі і цёці на сцэне — у такім выглядзе?

Добрых прыкладаў у сусветнай эстрадзе шмат. Можна для пачатку што-небудзь у каго-небудзь падгледзець і пераняць. Нават у той жа Мадонны.

Чытачы каменціруюць ў сацыяльных сетках?

№ 27

Да матэрыялу "Несталіца ў сталіцы: пазнавальныя рысы?"

Юрый Ивановский:
"Пры ўсім тым, адзін са спектакляў Тамбоўскага тэатра — "Жаніцьба" паводле Гогаля моцна ўразіў рэжысёрскай вынаходлівасцю, тонкім гумарам, філасафічнасцю, высокай акцёрскай культурай. Міжволі параўнаў з класічнымі пастаноўкамі віцебскага тэатра (тым жа "Макбетам" Анісенкі), і гэтае параўнанне — не на карысць віцебскай рэжысуры. На маю думку, яна бязбожна эксплуатуе акцёра, не валодаючы здольнасцю "прыдумаць", сачыніць спектакль, відаць, занадта літаральна разумеючы вядомы выраз Неміровіча-Данчанкі пра тое, што рэжысёр павінен памерці ў акцёры".

№ 25

Да матэрыялу "І вярнуцца..."

Grigory Borovik:
"Васіль Быкаў напісаў п'есу "Апошні шанц" — яе ў работу ўзяў МХАТ імя Максіма Горкага. Мне пашчасціла працаваць над варыянтам гэтага твора і яго пастаноўкай. Мастаком быў запрошаны, па маёй прапанове, Юрый Тур. Гэта было вельмі павучальнае і карыснае для маладога рэжысёра супрацоўніцтва".

№ 30

Да матэрыялу "Пасля чарговага "аблому": а ў суботу — нефармальны выхадны?"

Grigory Borovik:
"Даўным-даўно адзін паніч знайшоў на дарозе каменьчык. Аказалася, што згубіў яго нейкі іншаземец. Пан сказаў усім: гэты каменьчык — рэліквія майго роду. Во як гэта ўсё было..."

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў народнага артыста СССР Ігара Лучанка з 75-годдзем. Пра гэта паведаміла Прэс-служба Кіраўніка дзяржавы. "Усё сваё жыццё Вы прысвяцілі нястомнаму служэнню мастацтву. Вашы творы, якія ўвабралі ў сябе найлепшыя рысы і традыцыі нацыянальнай музычнай культуры, уваходзяць у рэпертуар некалькіх пакаленняў выканаўцаў і з'яўляюцца сапраўднай візітнай карткай нашай краіны ў свеце", — гаворыцца, у прыватнасці, у віншаванні. "Глыбокай павагі і прызнання заслугоўвае Ваша шматгадовая грамадская дзейнасць на пасадзе старшыні Беларускага саюза кампазітараў, вялікі асабісты ўклад у развіццё і папулярызацыю айчыннай музыкі", — адзначыў Прэзідэнт.

Ігар Лучанок з бацькамі: мама — Аляксандра Герасімаўна, тата — Міхаіл Лукіч. 1968 г.

75 "з прыцэлам" на будучыню!

У аўторак Ігару Лучанку споўнілася 75! Народны артыст Беларусі і СССР, нязменны, на працягу апошніх 33-х гадоў, старшыня Беларускага саюза кампазітараў… Для большасці з нас ён, найперш, — наша спадчына: не толькі аднайменная песня на купалаўскі верш, але і самая сапраўдная, найкаштоўная песенная класіка…

А між тым, не Лучанок абраў песню — яна сама абрала яго. Кансерваторыю ён заканчваў з недапісанай операй — на свае вочы бачыла яе клавір сярод архіўных нотных аркушаў Саюза кампазітараў. Піяністы і дасюль граюць ягоныя авангардныя па стылі прэлюдыі, струннікі — квартэт. Дый знакамітая "песняроўская" рок-опера "Гусляр", некалькі гадоў таму адноўленая паралельна двума калектывамі — Нацыянальным акадэмічным народным аркестрам імя І.Жыновіча і музыкантамі на чале з Андрэем Скарынкіным, — была спачатку дыпломнай работай у выглядзе акадэмічнай кантаты. Прычым некалькімі гадамі раней паводле таго ж самага купалаўскага "Кургана" на той жа самы выканальніцкі склад — салісты, хор і аркестр — напісаў сваю вакальна-сімфанічную паэму (таксама як дыплом!) іншы кампазітар, тады яшчэ студэнт па класе прафесара Анатоля Багатырова, у якога пазней заканчваў і Лучанок. Гэта ж якую творчую смеласць трэба было мець, каб адважыцца на такі "дубль"!

Затое ў святкаванні юбілеяў ён надта цнатлівы-сарамлівы. Не толькі сам ніколі не ўзгадвае ды не выступае з ініцыятывай нейкіх святкаванняў, хаця б у выглядзе творчага вечара, а яшчэ і мае звычку "знікаць": штогод на пачатку жніўня ці з'язджае куды-небудзь, каб "не дасталі", ці проста "вырубае" ўсе тэлефоны, насамрэч сыходзячы ў "падполле". Так і сёлета. Нават напярэдадні на ўсе прапановы "юбілейнага інтэрв'ю" толькі адмахваўся: маўляў, у лістападзе — снежні Беларускаму саюзу кампазітараў споўніцца 80 гадоў, да гэтай падзеі будзе прымеркаваны расцягнуты па часе цыкл канцэртаў — пра гэта і пішыце!

Надзея БУНЦЭВІЧ
Фота Юрыя ІВАНОВА з архіва

АКТАВА Пракапцова

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў заслужанага дзеяча мастацтваў краіны, генеральнага дырэктара Нацыянальнага мастацкага музея Уладзіміра Пракапцова з 60-годдзем.
"Сваё жыццё вы прысвяцілі нястомнаму служэнню беларускаму мастацтву. Дзякуючы вашаму шматграннаму таленту, энергіі і аўтарытэту Нацыянальны мастацкі музей стаў вядучым культурным і навукова-асветным цэнтрам нашай краіны, дзейнасць якога шырока вядома ва ўсім свеце", — гаворыцца, у прыватнасці, у віншаванні.

8 жніўня ў 8 гадзін 8 хвілін 8 секунд у Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі адкрылася выстаўка работ Уладзіміра ПРАКАПЦОВА. Яна будзе доўжыцца 8 дзён, 8 гадзін, 8 хвілін, 8 секунд. Не адыходзячы далёка ад лічбы "8", я папрасіў Уладзіміра Іванавіча ўспомніць 8 падзей са свайго жыцця. Дарэчы, слова "актава", ужытае ў загалоўку, паходзіць ад лацінскага "восьмая"…

Восем успамінаў юбіляра

Першы ўспамін: 8 жніўня 1958 года

— На дзень нараджэння мне падарылі акварэльныя фарбы; сем "гузікаў", прылепленых да кардонкі ў форме палітры. Пэндзлік быў для клея з шорсткага шчаціння. Я маляваў на адваротным баку шпалераў, якія засталіся ад рамонту, перамалёўваючы садавіну з альбома пра Мічурына. Тата Іван Пятровіч хацеў, каб я стаў аграномам…

Другі ўспамін: 1 верасня 1960 года

— Мая маці, Марыя Андрэеўна, з чорнага саціну пашыла мне шаравары з гумкамі і белую кашулю. Школа ў Жгунскай Будзе была васьмігадовая. Вучыцца хацелася. Ясна памятаю сябе з вялікім букетам гладыёлусаў…

Трэці ўспамін: 17 снежня 1969 года

— Снегу за ноч намяло — да самага даху. Добра, што рыдлёўку ў сенцах пакінулі. Пракапалі з бацькам тунэль да самай дарогі. Да школы ў Добрушы — 8 кіламетраў. Разам з цёзкам Гарбачовым па шпалах жалезнай дарогі прыйшлі ў школу. Нас было двое з вёскі. Астатнія васямнаццаць не прыйшлі…

Чацвёрты ўспамін: 20 ліпеня 1970 года

— Начным аўтобусам прыехаў у Віцебск на золку. Спусціўся да Дзвіны, памыўся і накіраваўся ў інстытут, ён знаходзіўся непадалёк ад ракі, побач з Тэатрам імя Якуба Коласа. Здаваў экзамены на мастацка-графічны факультэт педагагічнага інстытута. Конкурс — тры чалавекі на месца. Але я паступіў…

Пяты ўспамін: 4 сакавіка 1973 года

— Нядзеля. З эцюднікам у парку Мазурына. Сонца, прабіваючыся праз лістоту, асвятліла постаць дзяўчыны арэолам. "Муза!" Сэрца закалацілася!.. Аловак схопліваў сілуэт музы. Думкі мітусіліся… "Падыдзі ды спытай, як яе клічуць!" Саромеўся. Больш я яе не бачыў. Толькі чакаў сустрэчы…

Шосты ўспамін: 14 кастрычніка 1977 года

— Белавежская пушча. Я — аспірант Інстытута мастацтвазнаўства этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук. У холе гатэля чую чароўныя гукі Паланэза Агінскага. Старэнькае піяніна абступіла чалавек сорак. Я літаральна ўлятаю ў натоўп. Усе расступіліся. "Яна! Муза!" Мелодыя пранікае ў сэрца і ў галаву… Нікога не бачу… Пытаюся: "Муза?". "Не, Вера…" Муза набыла рэальныя абрысы. У нас — двое дзяцей. Антону — 31, Паўлу — 29…

Сёмы ўспамін: 26 верасня 1992 года

— У сакавіку мяне рэкамендавалі на пасаду намесніка начальніка ўпраўлення сацыяльна-культурнай палітыкі апарата Савета Міністраў. Прайшло шэсць месяцаў, мяне не зацвярджаюць. Заслаўе. Прыём ад імя Саўміна. Вячаслаў Кебіч падышоў да мяне: "Як прозвішча?". "Пракапцоў". "Нефармал?". Я паціснуў плячыма: "Старшы навуковы супрацоўнік Інстытута мастацтвазнаўства". "Прычоска ў вас нефармальная", — усміхнуўся ён і паляпаў па плячы: —"Зацвердзім!.."

Восьмы ўспамін: 8 жніўня 2013 года

— Успамін пра гэта яшчэ наперадзе...

Юрый ІВАНОЎ
Фота аўтара

P.S. *Калі адбіраў фотаздымак юбіляра для публікацыі, выбар прыпаў на нумар восем.*

Прэзідэнт краіны павіншаваў народнага артыста Беларусі Віктара Манаева з 55-годдзем. Пра гэта паведаміла Прэс-служба Кіраўніка дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка выказаў надзею, што Віктар Манаеў і ў далейшым будзе гэтак жа плённа ды самааддана служыць тэатру, радаваць прэм'ерамі шматлікіх прыхільнікаў, узбагачаць сваёй творчасцю скарбніцу беларускага мастацтва. Прэзідэнт пажадаў артысту здароўя, невычэрпнага натхнення, новых творчых поспехаў, шчасця і дабрабыту.

Невычэрпнасць таленту

Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

Вялікая беларуская сцяна перад "новай драмай"

Частка II

Сённяшнія ўдзельнікі апытання "К" наконт прызнання (нават удакладнім: прызнання існавання) феномену беларускай "новай драмы" — Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы, Магілёўскі абласны драматычны тэатр і Магілёўскі абласны тэатр драмы і камедыі імя В.І. Дуніна-Марцінкевіча (г. Бабруйск) у асобах іх творчых кіраўнікоў і мэнэджараў выявілі цікавую тэндэнцыю ў сваіх меркаваннях: "новая драма" — усяго толькі ўмоўны тэрмін, за якім — канкрэтныя п'есы канкрэтных аўтараў. А самога "хлопчыка", атрымліваецца, не існуе.

"У чым тая драма "новая"?"

Мікалай ПІНІГІН, мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь:

— Я не ведаю, што такое "новая драма". "Старая", "новая"... Для мяне ёсць такія катэгорыі, як добрая ці дрэнная п'еса. Творы Чэхава ў свой час таксама з'яўляліся "новай драмай", у параўнанні з п'есамі драматургаў іншых стагоддзяў. У наступным сезоне мы будзем ставіць п'есу Дзмітрыя Багаслаўскага "Ціхі шоргат сыходзячых крокаў", у 2014 годзе — новы твор Юліі Чарняўскай "Сірожа", але, выбачайце, я лічу за лепшае называць гэтыя творы добрай беларускай драматургіяй. А калі іх далучаюць да "новай драмы", мне не зразумела: у чым тая драма — "новая"?

— **У першую чаргу тым, што яна звяртаецца да актуальных праблем грамадства...**

— А "Пан Тадэвуш" Адама Міцкевіча — на ваш погляд, гэта твор, які не цікавы сучаснаму гледачу? Ён не актуальны для сённяшнага часу?

— Гледзячы як паставіць. Бо на нашай тэатральнай сцэне ідуць пастаноўкі класікаў, што пазбаўлены той самай актуальнасці...

— Не бяруся судзіць. Каго ж далучаюць да аўтараў "новай драмы"?

— **Таго ж Дзмітрыя Багаслаўскага, Канстанціна Сцешыка, Паўла Пражко...**

— Ведаеце, я не займаюся маніфестамі. Я бяру п'есу, якую лічу актуальнай для цяперашняга моманту, — і стаўлю. Мне зараз 56 гадоў, і, да прыкладу, тыя праблемы, што ўзнімае ў сваіх п'есах Павел Пражко, мяне не чапляюць. Хоць, вядома, ягоныя творы я лічу драматургіяй. Аднак ненарматыўная лексіка не павінна гучаць з нацыянальнай сцэны. Увогуле, мат — мяркую, рэч, не ўласцівая беларускамоўнай прасторы. Чаму ён абавязаны гучаць з падмосткаў Нацыянальнага тэатра? У студыі — так, гэткі эксперымент можа быць, але не ў галоўным тэатры краіны.

Ды ўвогуле, я не хачу трансляваць тое, што зыходзіць з яго твораў: нянавісць, пэўныя рэфлексіі да рэчаіснасці... Для мяне любоў — найважнейшая з катэгорый. Даруйце, але ванітаваць сваімі праблемамі, інакш і не скажаш, — мне не цікава. Калі ў п'есе няма вось гэтай вертыкалі "Бог — Зямля" (падкрэслю, што выказваю сваё асабістае меркаванне), твор мяне не прываблівае.

— Аднак Багаслаўскага вы ставіце?

— Так, бо лічу яго твор вартым увасаблення на сцэне. Мне даўно не сустракалася п'еса такога ўзроўню. Я назаву яе цудоўнай.

— Павел Пражко выкарыстоўвае тую ж ненарматыўную лексіку як прыём. Увогуле, ён звяртаецца да таго, што адбываецца навокал, вымалёўваючы ў сваіх п'есах і лексіку, манеру гаварыць, якой карыстаюцца сучасныя людзі...

— Але ёсць людзі, якія карыстаюцца іншай лексікай, так? Гэта як тое ж пытанне мовы. Я разумею, што сёння рускую мову мы чуем у жыцці часцей за беларускую, аднак ёсць маладыя людзі, якія размаўляюць на беларускай мове, і за імі — будучыня.

У Купалаўскім тэатры пастановак па-руску ніколі не будзе, гэта нават не абмяркоўваецца. Як казаў Уладзімір Набокаў, "феномен вялікага пісьменніка — гэта феномен мовы". Не ідэі. Маецца на ўвазе паэтыка пісьменніка, якасць гэтай мовы. І я цалкам падтрымліваю гэтую думку...

— Пошук сучаснай тэатральнай мовы адбываецца і на нашым форуме "М.@rt.кантакт": фестываль для гэтага і быў створаны — як пляцоўка для размовы пра тое, якім можа быць сучасны тэатр. Аднак, на мой погляд, праблема тут у іншым: у адсутнасці тэатральнай канкурэнцыі ў нашым асяродку.

Паглядзіце, у нашым горадзе — толькі адзін драматычны тэатр. Зусім нядаўна быў у польскім Любліне: ён па памеры — прыблізна як Магілёў, але ў горадзе — 15 тэатраў, і кожны прапаноўвае сваю мову, сваё разуменне сучаснага тэатра.

Андрэй НОВІКАЎ, дырэктар Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра:

"Павінна быць здаровая канкурэнцыя"

— Гэтае пытанне трэба было б адрасаваць мастацкаму кіраўніку тэатра, але, на жаль, да гэтай пары ён не прызначаны. П'есы беларускіх драматургаў на нашай сцэне ідуць: тых жа Ткачова, Пражко, Чарняўскай, Кавалёва, Дударава... Але ці магу я назваць пэўныя з іх творамі "новай драмы"?.. На маю думку, існуе такое паняцце, як сучасная драматургія, а вось "новая драма"... У Расіі гэтая "хваля" даўно схлынула — і адбываецца звычайны працэс пастаноўкі добрых аўтараў, да якіх далучаюць і беларускіх драматургаў.

— Але ж менавіта расіяне акрэслілі гэты феномен беларускай "новай драмы", вылучаючы адметнасць, пошук новай сцэнічнай мовы аўтарамі дадзеных п'ес...

Сёння рэпертуарныя тэатры ператварыліся ў з'яву мас-культуры, бо ім трэба зарабляць грошы. Па сутнасці, тэатры ўжо выконваюць рэпрэзентатыўную функцыю, бо трэба дагадзіць самым розным пластам насельніцтва: і сталаму гледачу, і сярэдняму пакаленню, і зрабіць пастаноўкі для дзяцей...

Калі б тэатральная прастора была пашырана і ў ёй віравалі розныя маленькія тэатры, студыі, лабараторыі, то і адкрылася больш магчымасцей для пастановак п'ес сучасных драматургаў, і не важна, да якога руху яны належаць. Павінна быць здаровая тэатральная канкурэнцыя, каб у кожнай пастаноўкі была свая мэтавая аўдыторыя. Наш тэатр адкрыты для эксперыменту, але яго абавязкі рэпертуарнага тэатра, у той жа час, ніхто не адмяняў...

Максім СОХАР, галоўны рэжысёр Магілёўскага абласнога тэатра драмы і камедыі імя В.І. Дуніна-Марцінкевіча (Бабруйск):

"Не лічу гэта з'явай"

— Такое паняцце, як "новая драма", — для нас чужое. На маю думку, гэта не больш чым форма піяру. У свой час і Астроўскі, і Чэхаў, і Гогаль лічыліся аўтарамі "новай драмы". Ёсць новыя аўтары ў драматургіі, якія альбо цікавыя, альбо не, — усё проста. У некалькіх расійскіх тэатрах рэжысёры ўпадабалі п'есы некалькіх сучасных беларускіх драматургаў — і яны іх паставілі. Вось і ўсё! Гэта заканамерны працэс з'яўлення новых аўтараў, але зусім не адметны жанр літаратуры. Я не лічу гэта з'явай.

— "Новая драма" ўсяго толькі імкнецца знайсці новую мову для апісання тых змен, якія адбываюцца з сённяшнім грамадствам. Не думаю, што аўтары ставяць сваёй задачай вынайсці пэўны новы жанр...

— У гэтым не бачу праблемы. Праз 150 — 200 гадоў з'явяцца новыя майстры, якія будуць шукаць новую мову, і, напэўна, творы Паўла Пражко пачнуць лічыцца класікай. Аднак акцёры, што выходзяць на сцэну, за сто гадоў ніяк не змяніліся. Не змяніўся глядач. Не змяніліся такія паняцці, як каханне, здрада, сяброўства, вернасць... Так, жыццё стала больш хуткім, з'явілася больш запазычаных з іншых моў слоў, сучасныя тэхналогіі, дэвайсы, аднак... Стасункі паміж людзьмі не змяніліся. І, на маю думку, аўтары "новай драмы" ўсяго толькі начыняюць прастору сваіх твораў новымі паняццямі, "украпінамі" сучаснасці, але нічога прынцыпова новага нам не паведамляюць.

На маю думку, усё проста: ёсць новыя цікавыя аўтары, а вось самой "новай драмы" не існуе.

— Хто-небудзь з гэтых новых цікавых аўтараў вас зацікавіў?

— Так, у нашым тэатры зараз ідуць рэпетыцыі пастаноўкі па п'есе Васіля Ткачова "Без Ягора будзе гора". Вядуцца перамовы з Дзіянай Балыка, перакладаем твор Андрэя Карэліна... У нас на пастаяннай аснове адбываецца маніторынг беларускай драматургіі. Лічу, што калі п'еса цікавая, яна заўжды знойдзе і свайго рэжысёра, і свайго гледача.

— Увосень у вашым тэатры пройдзе чарговы Рэспубліканскі фестываль нацыянальнай драматургіі імя Дуніна-Марцінкевіча. Якую мэту вы ставіце яго правядзеннем?

— Так, сёння сучасную драматургію можна знайсці ў Інтэрнэце, але ў Сусветным павуцінні часам не цяжка і згубіцца, таму мы даём магчымасць маладым аўтарам прадставіць сябе, свае творы ў рамках фестывалю.

Вялікую працу ў прэзентацыі беларускіх аўтараў робіць Цэнтр сучаснай драматургіі і рэжысуры — нельга забывацца на яго актыўнасць. Новыя імёны з'яўляюцца, адбываецца нармальны працэс, і, паўтаруся, калі творы новых драматургаў — глыбокія, разумныя ды якасныя, то яны абавязкова знойдуць сваю сцэну. Аднак называць п'есы пэўных аўтараў "новай драмай" — гэта, мяркую, кітч...

(Працяг тэмы будзе.)

Падрыхтавала Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ
Фота Андрэя СПРЫНЧАНА, Юрыя ІВАНОВА і з архіва Магілёўскага абласнога тэатра драмы і камедыі імя В.І. Дуніна-Марцінкевіча

Тэатральная плошча

Помста Уільяму “двойчы навыварат”

18 ліпеня Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі закрыў сезон сваёй нядаўняй прэм’ерай — спектаклем “Бегчы з Эльсінора, або Гамлет навыварат”. Гэта і сапраўды тая пастаноўка, якая вымушае... бегчы: каб заняць лепшыя месцы ў зале — ці каб хутчэй тую залу пакінуць...

Глядзець ці не глядзець? — пытанне толькі ў гэтым?

Не заўважыць новага “Гамлета” немагчыма. Мінаючы тэатр увечары перад пачаткам спектакля, нават з вокнаў аўтобуса вы абавязкова звернеце ўвагу на дзівака ў процівагазе з рупарам у руках, які ходзіць па прыступках, запрашаючы ўсіх на прэм’еру. Такі піяр-ход — яшчэ і своеасаблівы “тэст”. Асабіста я пускала б у залу толькі тых, хто ўсміхаецца ў адказ, а не аглядаецца ў пошуках міліцыянера. Дарэчы, калі б і знайшоўся нейкі надта апантаны вартавы парадку, дык ягонае памкненне прыцягнуць парушальніка спакою да адказнасці трэба было б расцэньваць як міжнародны скандал, бо пастаноўшчыкам спектакля з гэткай вулічнай уверцюрай выступіў малады ўкраінскі рэжысёр Сяргей Паўлюк. А эпатажную п’есу, дзе героі кідаюць выклік Шэкспіру, напісаў украінскі драматург Віктар Понізаў — загадчык літаратурнай часткі Нікалаеўскага акадэмічнага ўкраінскага тэатра драмы і музычнай камедыі. Так што цяперашняя прэм’ера, пры жаданні, можа быць з поўным правам трактавана як замежная экспансія на тэатр, які ўжо паводле назвы павінен купляць “сваё, беларускае”.

Дарма думаць, што для нас цяперашняя прэм’ера — толькі першае знаёмства з постмадэрнісцкім перапісваннем “навыварат” вядомых сюжэтаў ды літаратурных твораў не толькі ў рэжысуры, але і ў самім драматургічным матэрыяле. Ды большасць п’ес Сяргея Кавалёва — менавіта такога кірунку! Але стаўленне да першакрыніц у іх больш ашчаднае, папраўдзе “памяркоўнае”. Прычым у асноўным тыя крыніцы вядомыя хіба спецыялістам. А тут — “Гамлет”! Калі хто і не чытаў, дык ведае хаця б пачатак маналога “Быць ці не быць?..”. Таму і “пераробкі” ўспрымаюцца больш кідка.

Але што цікава: у нашым спектаклі перароблены не адно “Гамлет”, але і сама п’еса Понізава, дзе героі ўзбунтаваліся супраць Шэкспіра. Аўтар разважаў пра наканаванасць лёсу, прадвызначанасць падзей, якія кіруюць людзьмі нават тады, калі тым здаецца, што яны робяць уласны выбар. А рэжысёр — пра асаблівасці насілля: дастаткова хаця б аднойчы выпусціць яго на волю, як яно пачынае расці ды расці. У п’есе героі быццам мяняліся месцамі — і тая перастаноўка складнікаў ніяк не ўплывала на выніковую суму. Клаўдзій атручвае Караля ці Гамлет забівае Клаўдзія — ніякай розніцы, бо Шэкспір, як мы даведваемся ў фінале п’есы, перапісаў сцэнарый, пакінуўшы нязменнай смерць усіх герояў. Ад гэтага фаталізму, замяшанага на містыцы, рэжысёр цалкам адмовіўся, зрабіўшы спектакль куды глыбейшым. Ён развіў, ледзь не да абсурду, закладзеныя ў персанажаў шэкспіраўскія характары, выявіў іх сапраўдную сутнасць — і прыйшоў да высновы, сугучнай роздумам Дастаеўскага: нельга рабіць дабро праз зло — насілле не можа быць апраўдана ніякімі высокімі мэтамі.

Працягваючы гэтыя думкі, Понізаў прыходзіць яшчэ да адной: дабро, як і ўсё іншае ў свеце, не можа быць татальным. Стаўшы на гэты шлях, яно становіцца злом. Пачуццё справядлівасці ў Гамлета абвострана настолькі, што перарастае ў помсту. І тое, што ён быццам бы незнарок забівае Клаўдзія, які не падпарадкаваўся агульнаму памкненню пайсці супраць Шэкспіра, зусім не выпадкова: спрацоўвае падсвядомасць. А тое, што Гамлет ужо свядома намагаецца схаваць злачынства, прыводзіць да цэлай чарады смерцяў. У адрозненне ад п’есы, ён сам і перарывае той смяротны ланцужок, пусціўшы сабе кулю ў скроню.

Усе гэтыя філасофскія выкладкі пададзены ў спектаклі на сучаснай тэатральнай мове, блізкай прасунутай моладзі. Не хвалюйцеся, з мовай літаратурнай усё ў парадку: стылізацыя пад Шэкспіра. А тое, як мілагучна, сакавіта, з густам Дзіяна Даражок, кіраўнік аддзела знешніх сувязей Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, перарабіла бляклы рускамоўны арыгінал на беларускамоўную “цукерачку”, заслугоўвае асаблівага прызнання. Мова ж тэатральная пабудавана не толькі на эпатажы, але і, спрэс, на багатых асацыятыўных шэрагах. Рэжысёр Сяргей Паўлюк, адказваючы адначасова за сцэнаграфію і падбор музыкі, стварае сапраўдны аўтарскі тэатр. Чаго вартая хаця б Смерць (гэтага персанажа ў п’есе няма) у абліччы Адэты з “Лебядзінага возера”! Ці горкай складзеныя процівагазы як намёк на карціну Васіля Верашчагіна “Апафеоз вайны” (не бяда, што некаторыя яе ведаюць хіба па колішнім рэкламным роліку). Мноства экранаў, відэатрансляцыі, творчае выкарыстанне магчымасцей святла, гуку і простых эфектаў накшталт дыму на сцэне стварае неверагодную сумесь рэаліці-шоу, фэнтазі, трылера, філасофскай драмы, эстраднага гала-канцэрта — спіс можна доўжыць да бясконцасці. Такое шматслойнае відовішча можна глядзець раз за разам, увесь час адкрываючы ўсё новыя дэталі.

А як працуюць артысты! Слабых акцёрскіх работ папросту няма, кожны — зорка, прычым усе раскрываюцца абсалютна з іншага боку, чым мы прызвычаіліся іх бачыць. Гэтак жа, як з іншага боку раскрываюцца і самі шэкспіраўскія характары, парушаючы ўсе стэрэатыпы. Тэмпарытм спектакля, пры ўсіх яго філасофстваваннях, ледзь не зашкальвае. Маўляў, вы хочаце кліпаў — іх ёсць у мяне. Дапамагае гэтаму і музычная “нарэзка”, вінегрэт у якой не толькі не парушае агульнай эстэтыкі, а яшчэ і садзейнічае эфекту “25-га кадра”. Усё гэта вымушае гледачоў, хочуць яны таго ці не, не толькі глядзець, а яшчэ і думаць. Самастойна. І, што важна, — без прымусаў у выглядзе плакатных лозунгаў. Усё акурат наадварот — па прыкладзе рэкламы, дзе вялікімі літарамі — “Глядзець!”. Ці нават: “Не глядзець!”, бо забарону так і хочацца парушыць. А знізу — маленькімі: “Думаць”. Калі на гэтую “прыманку” патрапіць не толькі “прыкормленая” да інтэлектуальнага тэатра публіка, але і тыя, хто думаць не прывык, а таксама тыя, хто выхаваны на непарушнасці класікі ды праславутага рэалізму, “улоў” абяцае быць асабліва багатым. Ці ж не пра гэта мы марым?..

Надзея БУНЦЭВІЧ



На здымку: сцэна са спектакля.

Contemporary art

Т.Радзівілка. "Ігракі І".

“Парккультуры”

“Парккультуры” — як прастора ўспамінаў, як таямнічае месца, як рака Ганг, з якой “выплываюць”, узнікаюць абліччы. Праект Тацяны Радзівілка, прэзентаваны ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва ў форме персанальнага каталога, стаўся своеасаблівым падарожжам аўтара па маршрутах асабістай і калектыўнай памяці.

Антрацытавы, бура-карычневы, бардовы, пажоўкла-жоўты… Жывапісец, графік і мастак-літаграфіст Тацяна Радзівілка для стварэння эмацыйнага прасторавага фона сваіх жывапісных работ выбірае колеры выцвілых фатаграфій, колеры старых сямейных фотаальбомаў, у якіх выява часам ператвараецца ў адно згадку, контур, пляму, марыва… Што робяць фігуры (твараў не разабраць), апранутыя, здаецца, па модзе сярэдзіны XIX стагоддзя на гэтай старой карце памяці? Стаяць, купаюцца, шпацыруюць, гуляюць… Ды нічога сур’ёзнага! Аднак — дзіўная рэч! — гледзячы на іх неабавязковыя заняткі, мы чамусьці не можам утрымацца ад спакусы запусціць механізм уласных успамінаў, узнаўляючы фрагменты свайго дзяцінства ці малалецтва ды карэлюючы свой збянтэжаны позірк дзіцяці, падлетка з аўтарскім.

Памяць — дзіўная рэч: здаецца, яна належыць толькі табе аднаму, аднак высвятляецца, што яе карані ахопліваюць усё тваё пакаленне, пакаленні тваіх бацькоў, дзядуль, краіну наогул... Тацяна Радзівілка, эксперыментуючы з традыцыйнымі медыя (яны ў ейным выпадку такімі і не выглядаюць), праз свае работы і выяўляе гэты наш агульны савецкі досвед: калі высветляецца, што глядач *ведае* пра гэты містычны “Парккультуры”, *памятае* тыя моманты, хоць, магчыма, яны з ім ніколі не здараліся…

Што можам мы ўбачыць за вытанчанай графічнай выявай каша з бутэлькамі малака, які трымае нейкая жанчына (“Рэфлексія IV”)?

Мастыхін

Фота, якое стала карцінай

У Музеі-сядзібе "Пружанскі палацык" — "Выстаўка трох карцін", дзе прадстаўлены работы члена Саюза мастакоў Расіі, аднаго з заснавальнікаў аб'яднання мастакоў-беларусаў Балтыі "Маю гонар!" з Санкт-Пецярбурга Івана Чарнякевіча — ураджэнца вёскі Плябанцы Пружанскага раёна. Работы, якія можна ўбачыць на выстаўцы, былі падораны музею аўтарам у дзень святкавання 580-годдзя Пружан.

І.Чарнякевіч. "Жанчыны Палесся. Фота пачатку XX ст.".

Чорна-белая праекцыя ў XX стагоддзе

Іван Чарнякевіч — вядомы мастак, які працуе ў розных тэхніках: алейны жывапіс, роспіс тканін, габелен... Ён плённа піша і актыўна ўдзельнічае ў шматлікіх выстаўках у розных краінах свету. Сёння ягоныя работы знаходзяцца ў калекцыях Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі, Музея кнігадрукавання Францыска Скарыны ў Полацку, Беларускім культурным цэнтры г. Сідней (Аўстралія), Рускім культурным цэнтры г. Сеул (Карэя), Ваенна-касмічнай акадэміі імя Мажайскага (Санкт-Пецярбург), у прыватных зборах Расіі, Нідэрландаў, Францыі, Італіі, Швейцарыі, ЗША.

Тры творы, падораныя "Пружанскаму палацыку", розныя па манеры, настроі і эмацыйным насычэнні. Карціна "Жанчыны Палесся. Фота пачатку XX ст." — своеасаблівае адлюстраванне Беларусі з яе цяжкім лёсам, знясільваючай працай і, у той жа час, з адкрытымі чыстымі людзьмі, якія жывуць на зямлі, гадуюць дзяцей. Работа выканана ў чорна-белай гаме, як і фотаздымак сялянскай сям'і пачатку XX стагоддзя (з архіва Ісака Сербава), што ўразіў ды натхніў мастака на напісанне карціны.

Зусім інакш гучыць яшчэ адно палатно на беларускую тэму — "Песня", дзе выявы людзей толькі намечаны з дапамогай розных геаметрычных форм. На карціне мастак выкарыстаў лаканічныя колеры: блакітны, шэры, белы. Дзякуючы стрыманым фарбам і простым, нават умоўным, формам напісання карціна падаецца гледачу празрыстай ды чыстай, як музыка, як гук беларускага слова. Адсутнасць дакладнасці ў выявах дазваляе зазірнуць у глыбіню, стаць часткай прасторы, якую адкрываюць мастацкія сродкі.

Буянне фарбаў, шырокі, нават крыху хаатычны, мазок, абсалютна свабоднае валоданне пэндзлем вызначаюць карціну "Сусвет". Яна прываблівае гледача рознакаляровымі лініямі ды злучэннямі, дазваляе сачыць за дынамікай гэтых пераходаў і далучыцца да працэсаў стварэння, малюючы для кожнага індывідуальныя вобразы ды выявы. Мастацтвазнаўцы адзначаюць, што для карцін Івана Чарнякевіча характэрна лёгкасць экспрэсіўнай манеры і ўяўная нестараннасць пісьма. Аднак менавіта лёгкасць, з якой піша аўтар, сведчыць аб яго вялікім мастацкім вопыце і школе, адмове ад вучнёўскага акадэмізму, асаблівым стане душы, свабодзе думкі ды самавыяўленні.

Наталля ПРАКАПОВІЧ, галоўны захавальнік фондаў Музея-сядзібы "Пружанскі палацык"

Дызайнерскі ход

Суполка "Neon Head" на вачах гледачоў фэсту "Рэха ДАХу" ў Пружанах стварала работу, прысвечаную Тадэвушу Рэйтэну. А ўжо ў гэтыя выхадныя на Ляхавіччыне, у Грушаўцы, на котлішчы Рэйтэнаў, распачнецца летнік-пленэр у гонар фаміліі, які 18 жніўня завершыцца Фестывалем традыцыйнай культуры і форумам эксперыментальнага мастацтва "ДАХ-21".



Фестываль

Пастаноўка-трыумфатар II Нацыянальнай тэатральнай прэміі скарыла і суседзяў-літоўцаў. "Пікавая дама" паводле Аляксандра Пушкіна ў бліскучай пастаноўцы галоўнага рэжысёра Гродзенскага абласнога тэатра лялек Алега Жугжды ўзяла працяглую авацыю на новым фэсце "Vasara" ў Друскінінкаі і ўхвалу журы. Назва ж форуму перакладаецца як "Радасць".

Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

з марывам успамінаў

Ці за выявай дзіцячага веласіпеда, якім кіруе нейкі хлопчык ("Рэфлексія II")? Ды не важна, хто і для чаго робіць тое, што робіць, — жанчына, хлопчык, мужчыны, якія п'юць напоі, дзіця… Мы факусіруем погляд на дэталі, прадмеце, які існаваў толькі ў тэрміне, прамежку пэўнай эпохі і які сышоў разам з ёю. Невыпадкова літаграфіі серыі "Рэфлексія" апрануты ў пампезныя рамы, якія нібыта падкрэсліваюць каштоўнасць прамінулых фрагментаў паўсядзённага жыцця, зніклых рэчаў. Гэты кош з бутэлькамі малака, веласіпед састарэлай мадэлі, дзіцячая сукенка ў палоску — пунктум, укол, лінк, які вядзе да нейкага агульнага ўспаміну, памяці, што належыць ужо не канкрэтнаму чалавеку, а цэламу калектыву, пакаленням, якія жылі "за савецкім часам", ды нават проста ведаюць пра яго праз савецкія фільмы. Нагэўна, справа менавіта ў гэтых здольнасцях памяці: захоўваць неабавязковыя карцінкі, нявыбудаваныя кадры, займальныя дробязі. Але кожная работа мастака спрацоўвае непасрэдна як адмысловы псіхалагічны тэст, адсылаючы рэцыпіента-гледача да цьмянага перажывання свайго назапашанага досведу. Падаецца, яшчэ трошкі — і можна будзе пачуць аўдыядарожку да ўласных успамінаў, якая таксама недзе "сядзіць" у нашай галаве.



Т.Радзівілка. "Ігракі III".

Дакладна прайграваючы гэты механізм працы памяці праз эксперымент з мастацкімі тэхнікамі — напрыклад, у рабоце "Фунікулёр", — увогуле, можна знайсці фрагмент дзіцячага малюнка. Таццяна Радзівілка ў сваім праекце здзейсніла, лічы, немагчымае: дазволіла калектыўным успамінам стаць персанальнымі ды наадварот. Яна зрабіла марыва агульнага ўспаміну "асабістым" — блізкім кожнаму, і, наадварот, дазволіла праз "цьмянае шкло" ўласных ненапісаных мемуараў убачыць контуры мінулай эпохі…

Дарэчы, цікава, што аўтар, узнаўляючы савецкае мінулае, звяртаецца да прасторы "Парккультуры" — месца, дзе час цячэ павольна, дзе людзі *бавяць* час, а не будуюць новы век. "Парккультуры" — як асаблівая геаметрыя перасоўванняў і рухаў, асаблівая пластыка пастаў... Магчыма, гэта найлепшая з настальгій па савецкім часе, калі дзень падаецца доўгім-доўгім, поўным новых абяцанняў ды адкрыццяў…

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ

Акцыя "К": журналісцкі аўтапрабег па СДК і не толькі

А гібеюць не толькі вёскі...

Неяк так атрымалася, што менавіта на прыкладзе Віцебшчыны мы пераканаліся: дэмаграфічная праблема для Беларусі — адна з самых надзённых. Ведалі пра гэта і да нашага аўтапрабегу. Скажам, даваеннае насельніцтва Дуброўна дасягала ці не сарака тысяч чалавек — цяпер жа тут жыве толькі дзесяць... Аднак працяг вандроўкі па Ушацкім раёне пераканаў: праз знікненне жыхароў гібеюць не толькі "бясстатусныя" вёскі, але нават і асобныя аграгарадкі. Натуральна, усё гэта не можа не адбіцца на стабільнасці працы ўстаноў культуры. Інакш кажучы, брэнды ёсць (адны азёры чаго вартыя!) — ды толькі прыросту насельніцтва не стае...

Што рабіць Вяркудам?

Дарога віецца сярод такога хараства, што аж дух займае! Зеляніна дрэў, блакіт азёраў — усё пераліваецца і зіхаціць пад сонечным ліпеньскім небам… Словам, у такіх вандроўках без лірычных адступленняў — ніяк не абысціся. Але спачатку — дзелавая канстатацыя поруч з журналісцкім аналізам.

Вяркуды — даволі звычайная беларуская вёска. І, відаць, не толькі для **Ушаччыны**. Каб не зграбны гмах СДК, паяднаны з прадуктовай крамай, можна было б і міма праскочыць праз бясконцыя палеткі. Натуральна, не праскочылі. На гадзінніку — 10.55, праехалі мы 275 кіламетраў. А жыхароў у паселішчы — 240... У 2009 годзе Вяркуды сталі аграгарадком. А паколькі клубік тут быў занядбаны, драўляны, вырашылі збудаваць новы, дзе месца знайшлося б і для бібліятэкі. Збудавалі, выкарыстаўшы пры гэтым немалую па тым часе суму грошай. Як распавядае кіраўнік СДК Ірына Краснова, мясцовая сельскагаспадарчая арганізацыя па тым часе была адносна моцнай. Аграгарадоцкі статус, як усе чакалі, павінен быў надаць мясцоваму вытворча-сацыяльнаму кангламерату дадатковы імпульс для далейшага развіцця. Аднак не: штосьці не заладзілася ў няпростым механізме вясковага адраджэння. Мясцовая сельская гаспадарка, кажа Ірына Краснова, нечакана абанкруцілася, а мясцовая малочна-таварная ферма будзе перанесена, як быццам, у суседнюю Дуброўку...

Справы, шчыра скажам, несуцяшальныя. А паколькі творчасць у нашым жыцці заўжды ўзаемазвязана з вытворчасцю, дык і дзейнасць СДК, па словах яго кіраўніка, цяпер мала каго цікавіць. Правялі, да прыкладу, не надта масавае Купалле, зарабілі на ім толькі 300 тысяч рублёў (увесь сённяшні пазабюджэт, па словах Ірыны Красновай). А на дыскатэку лічаныя маладыя людзі так і не прыйшлі: ну няма іх у аграгарадку! Гадавы ж план па аказанні платных паслуг — 11 мільёнаў рублёў. Як лічыць кіраўнік СДК, такі план — невыканальны…

Паказчык жыццяздольнасці любога паселішча — колькасць вучняў у мясцовай школе. Дык вось, у Вяркудаўскай школе-садку — 48 вучняў, ёсць класы, дзе навучаецца па два, тры чалавекі. Але гэта — асноўнае ядро клубных гурткоўцаў. Асноўнае ядро неплацежаздольных слухачоў, гледачоў, чытачоў...

У зоне абслугоўвання Вяркудаўскага СДК — 16 вёсак. Падтрымку Вяркудам тут аказвае ўжо добра знаёмы нам дырэктар аўтаклуба з Ушачаў Пётр Алексяёнак. Ён — не толькі калега, але і вучань Ірыны Красновай. Вось разам яны і працуюць на будучыню раёна. Але якой тая будучыня будзе для аграгарадка "Вяркуды" — невядома…

А вакол — 21 возера

Па дарозе з Вяркудаў на **Дуброўку** сустрэлі яшчэ адно возера, спрэс зарослае па берагах баршчавіком. Як потым высветлілася, для Віцебшчыны гэтая расліна — кшталту стыхійнага бедства.

А вось і Дуброўка. Час — 12.30. Мы праехалі 288 кіламетраў. У паселішчы — 262 жыхары. У дырэктара сельскага клуба Іны Паўловіч спачатку высвятляем, колькі дзяцей навучаецца ў мясцовай школцы. Аказваецца, 36 чалавек. Моладзь практычна адсутнічае. Далей Іна Генадзьеўна распавядае пра тое, што Дуброўка — не аграгарадок. Так, ферма будуецца, але міграцыя даярак і механізатараў — страшэнная. Не паспее Іна Паўловіч прызвычаіцца да новых дзяцей-гурткоўцаў, як яны знікаюць, бо бацькі разам з сем'ямі ў пошуках лепшай долі з'язджаюць у іншыя паселішчы. Так што ў вёсцы — шмат пустых хат, нават службовых, што выдаткоўвае СВК "Дуброўка"...

Ёсць гурток аздараўленчай гімнастыкі для сталых людзей, аднак у летні час ён не дзейнічае: па словах клубніцы, усё насельніцтва цягам дня завіхаецца ва ўласных гародах ці збірае чарніцы на здачу. Быў фальклорны калектыў, але і ён распаўся, бо аж восем чалавек за год сышлі, з'ехалі. А план па аказанні платных паслуг павялічыўся апошнім часам больш чым удвая: летась складаў два мільёны рублёў, сёлета — больш за пяць мільёнаў. І як яго выконваць?

Цікавая сітуацыя: паколькі карэннага насельніцтва па згаданых прычынах у Дуброўцы амаль не засталося, дык і пра мясцовы традыцыйны фальклор гаворкі няма. У выніку змешвання аўтэнтыкі ці не з усіх куткоў Беларусі атрымліваецца часам унікальны сімбіёз, зараджэнне якога варта датаваць пачаткам масавага перасялення з-за чарнобыльскай катастрофы...

1.

Калі дзейнасць сельскага клуба **мала каго цікавіць...**

Тым не менш, дырэктар клуба не апускае рук. І дзейнасць яе так ці інакш звязана з мясцовымі брэндамі: у ваколіцах — 21 возера, самае вялікае — Крывое (даўжынёй — больш за 20 кіламетраў). Вось яны ды вялікае жаданне захаваць вёску падштурхоўваюць Іну Генадзьеўну ладзіць на азёрных узбярэжжах самыя розныя святы: малака, беларускай лялькі, юшкі і вады... Неаспрэчна, Дуброўка выжывае і стараннямі дырэктара СК…

Лірычнае адступленне Яўгена Рагіна

Усё больш пераконваюся, што асноўны вясковы брэнд — не вытанчаная старадаўняя брама, не векавы дуб, нават не прахалоднае возера, а чалавек, які адчувае адказнасць за лёс аднавяскоўцаў, клубаў, культуры, гістарычнай спадчыны. Калі такіх няма, вёска паступова, але непазбежна знікае. Але, дзякаваць богу, яны ёсць. Іх мо не так шмат, як хацелася б, але гэта менавіта яны нараджаюць ідэі, не даюць спакойна спаць начальству, абабіваюць парогі ў пошуках праўды. Яны — сціплыя, не ўмеюць выхваляцца,

На людным месцы

Наш семінар на сібірскім фэсце

Магілёўскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці і культурна-асветніцкай работы ў ліпені заключыў Пагадненне аб культурным супрацоўніцтве з Новасібірскім цэнтрам беларускай культуры. Наогул, супрацоўніцтва Магілёўскага абласнога метадычнага цэнтра і Новасібірскага цэнтра беларускай культуры доўжыцца больш за дзесяць гадоў.

МАГІЛЁЎШЧЫНА

У ліпені ў рамках Пагаднення Новасібірскі цэнтр беларускай культуры і некамерцыйны фонд "Цэнтр народнай рамесніцкай культуры" запрасілі спецыяліста Магілёўскага АМЦНТ, народнага майстра Наталлю Дамянікаву правесці семінар і майстар-клас па аб'ёмным пляценні з саломкі. Семінар ладзіўся ў рамках II Міжрэгіянальнага свята лёну, што праходзіла 17 — 21 ліпеня ў раённым пасёлку Масляніна Новасібірскай вобласці. Таксама ў тамтэйшай мастацкай школе экспанаваліся вырабы вядучай майстрыхі Магілёўшчыны па саломкапляценні.

Пад час двухдзённага семінара Наталля Дамянікава азнаёміла з асновамі свайго мастацтва ўдзельнікаў — каля двух дзясяткаў спецыялістаў устаноў культуры і адукацыі. Спачатку была тэорыя: звесткі пра тое, як вырошчваць, нарыхтоўваць, захоўваць ды апрацоўваць саломку, а таксама падрабязны расповед пра традыцыі беларускага саломкапляцення. Потым надышла чарга практыкі: пад кіраўніцтвам майстра ўдзельнікі навучыліся асноўным прыёмам аб'ёмнага пляцення, а таксама вырабілі па некалькі саламяных сувеніраў (ляльку, анёла, сардэчка і інш.). Улічваючы, што большасць удзельнікаў упершыню спрабавала зрабіць з саломкі мастацкі выраб, гэта быў значны поспех.

Дадамо, што напрыканцы мінулага года майстры Магілёўскай вобласці экспанавалі свае гліняныя вырабы на VIII Міжнародным фестывалі сібірскай керамікі ў Новасібірску і былі ўганараваны дыпломамі ўдзельнікаў. Малады кераміст, метадыст нашага Цэнтра Аляксей Сапажкоў удзельнічаў у рабоце журы фестывалю, даваў майстар-клас па дробнай пластыцы. Па завяршэнні выстаўкі творы беларускіх майстроў былі перададзены ў дар Новасібірскаму цэнтру беларускай культуры. Таксама летась у гэтым горадзе праходзіў абласны семінар па беларускай народнай творчасці, арганізаваны мясцовым Цэнтрам беларускай культуры сумесна з Магілёўскім АМЦНТ. У ім прынялі ўдзел старшы выкладчык па класе цымбалаў Магілёўскага філіяла Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі Аксана Кузняцова і выкладчык харэаграфічных дысцыплін школы-каледжа мастацтваў, балетмайстар народнага ансамбля танца фольк-шоу балета "Альянс" Аляксей Лукашэвіч. А потым яны дэманстравалі сваё майстэрства на Першым Адкрытым фестывалі цымбалістаў і бандурыстаў у Сібіры.

У сваю чаргу, прадстаўнікі Новасібірскага цэнтра беларускай культуры, творчыя калектывы наведваюць Магілёўшчыну ў рамках розных мерапрыемстваў. Напрыклад, сёлета у Міжнародным фестывалі дзіцячай творчасці "Залатая пчолка" ў г. Клімавічы прымалі ўдзел ансамбль народнай песні "Каласок" Творчага аб'яднання "Тэатр народнай песні" Новасібірскага цэнтра беларускай культуры і яго юныя салісты, а таксама дзіцячы ансамбль народнай песні і танца "Даровіца" з Новасібірскай вобласці.

Плённае культурнае супрацоўніцтва паміж Магілёўшчынай і Новасібірскай вобласцю стала магчымым у многім дзякуючы дырэктару Новасібірскага цэнтра беларускай культуры Ніне Васільеўне Кабанавай. Яна — наша зямлячка, нарадзілася ў вёсцы Лазаравічы Быхаўскага раёна Магілёўшчыны. Пераехаўшы ў 1977 годзе ў Новасібірск, Ніна Васільеўна не забылася на свае карані і актыўна прапагандуе беларускую культуру ў

яны імкнуцца рабіць справу. Таму і не знікаюць рэшткі замкаў ды маёнткаў, а ў вёсках па-ранейшаму гучаць беларускія песні ды застаецца магутнай наша нацыянальная культура. І няхай будзе так.

Замчышча Улы, Хруцкі і аўтэнтыка

Бешанковіцкі раён сустрэў спёкай і цвёрдым перакананнем у тым, што вада ў калонках тут не такая смачная, як у суседніх раёнах Віцебшчыны... 14.00. 311 кіламетраў. **Ула**, як вядома, славіцца не толькі гарадзішчам, якое было адным з уплывовых цэнтраў Вялікага Княства Літоўскага, але і тым, што тут нарадзіўся знакаміты жывапісец Іван Хруцкі. Цікава, як абыгрываюцца гэтыя не абы-якія брэнды ў мясцовай бібліятэцы?

Да пасляабедзеннага адкрыцця ўстановы застаецца некалькі хвілін. Бібліятэкар Галіна Смалярова з'яўляецца з пахвальнай дакладнасцю. (Яшчэ раз паўторымся: за ўсе дні гэтага нашага аўтапрабегу мы не сутыкнуліся з парушэннямі працоўнага графіка ўстаноў культуры.) У бібліятэцы — музейны куточак, прысвечаны Хруцкаму. Усё зроблена з густам і павагай да майстра пэндзля. Галіна Мікалаеўна кажа, што Ула нават вуліцу мае, якая носіць імя жывапісца. Вось толькі крыўдна, што часам сцвярджаюць, нібыта мастак нарадзіўся ў Лепельскім раёне. "Абсалютная непавага да роднай гісторыі! — пераконвае бібліятэкар. — Проста, Ула ўваходзіла калісьці ў Лепельскі павет…"

Гісторыю ў бібліятэцы паважаюць ды любяць. Максімальна поўныя звесткі тут сабраны і пра мясцовае замчышча. Аднак на актыўнасць чытачоў усе гэтыя выключна важныя акалічнасці ўжо не надта ўплываюць...

У мясцовым СДК мы пазнаёміліся з мастацкім кіраўніком ансамбля "Ульяначка" Наталляй Сцепанец. Калектыў у тую пятніцу рыхтаваўся да выступлення на заключных мерапрыемствах "Славянскага базару ў Віцебску". Такі пашанотны абавязак прадастаўляецца "Ульяначцы" не ўпершыню.

Наталля паказала нам клубнае памяшканне. Як аказалася, пераўтворана яно з былой кінатэатральнай залы. Вокнаў няма, вентыляцыі — аніякай. А тут даводзіцца ладзіць не толькі канцэрты, але і дыскатэкі. Вытрымаць іх у летнюю спёку выпадае не кожнаму. Мо менавіта з гэтай прычыны на клубным інфармацыйным стэндзе ў цэнтры — пуста. Відаць, сорамна запрашаць туды, дзе некамфортна…

На здымках:
1. Чытач Улаўскай бібліятэкі.
2. Маёнтак у Бачэйкаве, дзе так і не выраслі грыбы.
3. Дырэктар Улаўскай бібліятэкі Галіна Смалярова ў музейным куточку Хруцкага.
4. Кіраўнік СДК у Бачэйкаве Тамара Ткачэнка апавядае пра ўстанову.
5. Пустая афіша Улы.

Лірычнае адступленне Кастуся Антановіча

У Доме культуры — няўтульна, у бібліятэцы — мала месца… Дзесьці мы ўжо гэта бачылі. І неаднойчы. Думаецца, калі маецца патэнцыйная аўдыторыя, жаданне ў работнікаў сферы культуры, а таксама паразуменне з раённымі ўладамі, чаму ж не ладзіць разнастайныя, хай сабе вясковыя ці местачковыя, фестывалі на адкрытых пляцоўках, асабліва калі яны маюць гістарычны падтэкст? Тая ж Ула валодае ўнікальным турыстычным патэнцыялам: побач з паселішчам — старажытнае замчышча, размешчанае на сутоцы дзвюх рэк. Чым не фестывальная пляцоўка?

Як мы ў Бачэйкаве скарб шукалі ды не знайшлі

З пункта гледжання "брэндаўтрымання", **Бачэйкава —** ці не галоўная вёска на Бешанковіччыне. І заслуга ў гэтым цалкам належыць колішнім уладальнікам мястэчка Цеханавецкім.

14.45. 339 кіламетраў. 900 жыхароў. Так, выміранне Бачэйкаву не пагражае. Вёскаўтваральнай тут з'яўляецца даволі моцнае меліярацыйнае прадпрыемства. Яго адміністрацыйнае памяшканне (шыкоўна адрамантаванае) месціцца ў адным будынку з СДК. А вось клубныя памяшканні (глядзельная зала ды маленькі кабінецік дырэктара) ніяк не выпадае назваць шыкоўнымі. Па-першае, плошчаў для гурткоўых заняткаў няма. Па-другое, асфальтаваная дарожка да клуба ў такіх выбоінах, што дзяўчаты, спяшаючыся ўвечары на танцы, раз-пораз ламаюць тут шпількі. А як выконваць план па аказанні платных паслуг? А ніяк, калі не рухацца і не падштурхоўваць заможных меліяратараў да сацыяльнага партнёрства...

Праблемы — вядомыя "К". Колькі гадоў таму мы запыталіся ў кіраўніцтва: а чаму для гурткоўай дзейнасці не выкарыстоўваецца дом лоўчага (адна з будынін сядзібнага комплексу Цеханавецкіх, што вельмі няблага захавалася і па сёння)? Чаму для тэатралізацый не выкарыстоўваецца шыкоўны старасвецкі дубовы гай? І менавіта тады, некалькі гадоў таму, прапанавалі кіраўніцтву СДК распрацаваць адмысловы творчы праект, звязаны са шматлікімі паданнямі пра скарб, закапаны ў адмысловым прысядзібным парку, таксама брэндавым па "пароднасці" дрэў. Сапраўды, акцыя магла б атрымацца цікавай для падлеткаў. Уявіце: "старая" карта з зашыфраваным гістарычным маршрутам да запаветнай скарбніцы ды шматлікія прыгоды, звязаныя з яе пошукамі!.. І ўсё — пад наглядам клубных работнікаў. Пад час такіх гульняў, як правіла, дзеці з ахвотай вывучаюць гісторыю роднага краю, знаёмяцца з лёсамі знакамітых землякоў, выпрацоўваюць навыкі археолагаў... Урэшце — дзейнічаюць не пад прымусам, а таму, што ім проста цікава. А ці шмат у нас такіх цікавых мерапрыемстваў?..

Але кіраўніцтва СДК за гэтыя гады змянілася, а сітуацыя — не: неаднаразова агучаныя праблемы па-ранейшаму замінаюць у працы. Цяпер клубнай установай кіруе Тамара Ткачэнка. Яна пагаджаецца: сапраўды, немагчыма разгарнуцца ў клубнай установе, якую складае, па сутнасці, адна глядзельная зала. Між тым, дом лоўчага пустуе зноў. Аказваецца, не абы-якую ў гістарычным плане будыніну спрабаваў выкупіць нейкі камерсант для таго, каб вырошчваць там... грыбы. Вырошчвацца яны не захацелі, таму камерсант хуценька адмовіўся ад ідэі ўзбагаціцца за кошт загадкавых Цеханавецкіх.

Мы запыталіся: а чаму ў справе павелічэння клубных плошчаў Бачэйкаву не дамагае аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Бешанковіцкага райвыканкама? Уцямнага адказу ад кіраўніка СДК мы так і не пачулі.

Бібліятэкар Галіна Беразоўская ў размове з намі вельмі расхвалявалася. Тым не менш, здолела паказаць бібліятэчны куточак, прысвечаны Цеханавецкім, распавесці пра тонкую мастацкую натуру кожнага з паноў і пра тое, што мясцовы, так званы англійскі, парк быў у свае часы адзіным на Беларусі. Такім, па сутнасці, фрагментарна і застаўся. Ахвотных на яго паглядзець — заўжды шмат. Але экскурсій па былым панскім котлішчы ні бібліятэка, ні клуб не робяць. Сітуацыя — стандартная для нашых устаноў, размешчаных у брэндавых мясцінах. І мы ў гэтым пераконваліся цягам усіх камандзіровачных дзён…

Агульнае лірычнае адступленне

Па ўнікальным краі бясконцых азёр мы праехалі ледзь не 400 кіламетраў, але не сустрэлі ніводнай аграсядзібы. Не пашанцавала? Не той маршрут выбралі? Ды, відаць, не. Выкупіць пустуючы дом — справа не танная. Вось расіянам гэта па кішэні. Таму на прыазёрных паркоўках легкавікі — спрэс з расійскімі нумарамі. Нічога не маем супраць, але, як прызнаўся адзін з замежных турыстаў, нашы местачковыя музеі з клубамі, як і беларуская культура ў цэлым, яго не надта цікавяць — накупацца б ды пазагараць уволю.

Што тут скажаш? Нам па-ранейшаму не стае рэкламы беларускіх вясковых брэндаў, бракуе ініцыятыўнасці ў справе максімальнага выкарыстання гэтых брэндаў для больш цікавай ды насычанай бібліятэчна-клубнай дзейнасці. Згадайце словы Наталлі Сцепанец з Улы пра тое, што замежнікі прагнуць пачуць ад нашых народных фальклорных калектываў не эстрадную стылізацыю, а менавіта аўтэнтыку. Іншая справа, што такіх самабытных "Ульяначак" у нас не надта шмат. Але хто замінае іх займець, стварыць у любым нашым паселішчы калі не адметнае свята, дык доўгатэрміновы творчы праект? Мо тады і вёскі перастануць гібець?..

Яўген РАГІН і Кастусь АНТАНОВІЧ,
нашы спецыяльныя карэспандэнты
Мінск — Віцебская вобласць — Магілёўская вобласць — Мінск
Фота аўтараў

На людным месцы

Агінскія: стратэгічны кірунак

Напрыканцы ліпеня ў літоўскім горадзе Рэтавас па ініцыятыве Маладзечанскага мясцовага дабрачыннага фонду "Спадчына Міхала Клеафаса Агінскага" і пры падтрымцы Рэтаўскага музея гісторыі і культуры Агінскіх прайшоў "круглы стол" "Беларусь — Літва: на шляху культурнага супрацоўніцтва".

МАЛАДЗЕЧНА

У ім прынялі ўдзел кіраўнікі ўстаноў культуры Рэспублікі Беларусь і Літоўскай Рэспублікі, прадстаўнікі органаў дзяржаўнага кіравання, грамадскіх арганізацый і бізнес-саюзаў. Асноўнымі мэтамі сталі падвядзенне вынікаў сумеснай працы, скіраванай на адраджэнне культурнай спадчыны роду Агінскіх, і вызначэнне напрамкаў супрацоўніцтва на перыяд 2013 — 2015 гг.

Прызнаючы важнасць сумесных міжнародных акцый і праектаў у развіцці міжкультурнага дыялога Літвы, Беларусі і іншых краін Еўропы, мэр горада Рэтавас — Антанас Чарнецкіс адзначыў: "Мы аб'ядноўваем людзей розных краін са сваёй унікальнай культурнай спадчынай. Разнастайнасць і творчае багацце — умова поспеху на культурным шляху".

Дырэктар Маладзечанскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя М.К. Агінскага Рыгор Сарока і дырэктар Рэтаўскага музея гісторыі і культуры Агінскіх Вітас Руткаускас, станоўча адзначаючы культурныя мерапрыемствы, якія былі рэалізаваны ў 2011 — 2013 гг. у рамках міжнародных праграм "Масты спадчыны Агінскіх" і "Шляхамі паланэзаў Агінскага", абвясцілі асноўныя кірункі далейшага супрацоўніцтва. "Наш праект адкрыты для ўсіх зацікаўленых і неабыякавых да нашай агульнай культуры ды гісторыі людзей. Спадзяюся на ўзбагачэнне нашага культурнага асяродка новымі ідэямі і цікавымі праектамі ў розных сферах творчай дзейнасці", — адзначыў Руткаускас.

З цікавымі прапановамі ў час пасяджэння "круглага стала" выступілі загадчык кафедры культуралогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, прафесар Аляксандр Смолік, краязнаўца Сяргей Верамейчык, дырэктар Нацыянальнага музея імя М.К. Чурлёніса Овальдас Даугеліс ды іншыя. Кульмінацыяй мерапрыемства стаў прагляд дакументальнай стужкі пра жыццё і творчасць М.К. Агінскага, знятай "Беларускім відэацэнтрам".

У бліжэйшы час плануецца распрацаваць Міжнародную культурную праграму "Шлях культуры Агінскіх", прымеркаваную да святкавання 250-годдзя з дня нараджэння М.К. Агінскага.

Павел САПОЦЬКА

Сібіры. У 2000-м узначаліла заснаваны ў Новасібірску Цэнтр беларускай культуры і з таго часу з'яўляецца нязменным яго кіраўніком.

Ніна Кабанава любіць наведваць сваю радзіму, пашырае культурнае супрацоўніцтва з беларускімі ўстановамі. "Мне падаецца жыццёва неабходным захоўваць беларускую культуру нават у далёкай Сібіры, — пераканана Ніна Васільеўна. — І асабліва важна перадаваць яе дзецям, прывіваць гэтыя каштоўнасці маладому пакаленню этнічных беларусаў. Трэба, каб дзеці чулі беларускую мову, наведвалі зямлю сваіх продкаў, дыхалі беларускім паветрам: гэта дапаможа ім ведаць і любіць сваю культуру, быць часткай беларускага народа".

Зазначым, што Магілёўскі абласны метадычны цэнтр напрыканцы мінулага года заключыў Пагадненне аб супрацоўніцтве з Навукова-метадычным Цэнтрам па культуразнаўстве Міністэрства культуры і турызму Азербайджанскай Рэспублікі, а ў гэтым маі — з Цэнтрам народнай культуры Літвы.

Вольга СЕМЧАНКА,
вядучы рэдактар Магілёўскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці і культурна-асветніцкай работы

Хіба кніга сёння — для калекцыянера?

Пра кніжны дызайн і дызайнераў: што дазваляе тэхналогія, а што — адукацыя?

У кнігарнях мне асабліва падабаюцца букіністычныя аддзелы. Я магу набыць кнігу за тое, што яна прыгожая, што ілюстрацыі да яе рабіў выдатны мастак. Асаблівую цікавасць маю да беларускай кніжнай графікі 1960-х — 80-х гадоў: тады над афармленнем кніг працавалі Барыс Забораў (да свайго ад'езду за мяжу), Арлен Кашкурэвіч, Георгій і Наталля Паплаўскія, Васіль Шаранговіч, Уладзімір Савіч, Валерый Славук, Алена Лось — выдатныя майстры з непаўторным творчым почыркам. Што ж да сучасных беларускіх мастакоў, якія шчыруюць у галіне кніжнага мастацтва, дык нельга адмовіць ім у майстэрстве, але жаданне набыць кнігу дзеля ілюстрацый, зробленых іх рукой, у мяне ўзнікае вельмі рэдка. У савецкі час беларуская паліграфія мела абмежаваныя магчымасці. Заказы на кнігі падарункавага класа нашы выдавецтвы размяшчалі альбо ў Маскве, альбо ў краінах сацыялістычнай супольнасці. Сёння ж каляровыя фотаальбомы, кнігі па мастацтве можна паспяхова друкаваць і дома. Чаму ж так здарылася, што шыкоўных кніг стала больш, а вартых называцца творамі мастацтва — менш? Прынамсі, так мне падаецца. З гэтым пытаннем я звярнуўся да вядомага мастака, выкладчыка Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Уладзіміра ЛУКАШЫКА.

— Па-першае, асобы кшталту Кашкурэвіча або Паплаўскага з'яўляюцца ў мастацтве не кожныя пяць і нават дзесяць гадоў. Па-другое, кніга ў 1960-я — 90-я была ці не адзіным даступным шырокай грамадзе носьбітам і сродкам захавання інфармацыі. Попыт на добрыя кнігі меўся велізарны. Адпаведнымі былі і наклады. Не дзіва, што кніга была для мастакоў прывабнай. Прычым у кніжнай графіцы мастак аб'ектыўна быў больш разняволены, чым жывапісец ці скульптар. І, нарэшце, як мастакі-манументалісты мазаікамі ды фрэскамі закрывалі хібы архітэктуры, так і мастакі-ілюстратары надавалі ўнікальнасць прадукцыі друкарняў, слабых у тэхнічных адносінах, а праз гэта — абмежаваных у выяўленчых магчымасцях. Сёння новыя друкарскія тэхналогіі і макетаванне кніг з дапамогай камп'ютара адкрылі для выдаўцоў новыя перспектывы, стварылі ілюзію таго, што можна ўвогуле абысціся без мастака: маўляў, хопіць і дасведчанага вярстальшчыка. Мяркую, трэба пачакаць, пакуль у выдавецтвах "нагуляюцца" ў новыя тэхналогіі і зразумеюць, што мастака, творцу камп'ютар не заменіць. Праўда, калі гаворка ідзе пра выданні прэзентацыйнага характару, якія прэтэндуюць на тое, каб быць заўважанымі, на ўзнагароды на кніжных конкурсах, дык у такіх праектах мастаку адводзіцца важная роля.

— А мо справа ў тым, што папяровая кніга як носьбіт інфармацыі адыходзіць у нябыт? Неяк я расказваў сыну пра адно апавяданне, якое вельмі ўразіла мяне ў маладосці. Яго зацікавіў сюжэт. Я ж паабяцаў, што знайду для яго кнігу, дзе тое апавяданне друкавалася. Ён адказаў: "Навошта?". І тут жа выцягнуў патрэбны тэкст з Інтэрнэту. Кніга стала электроннай... А вы студэнтам мастацтва кнігі выкладаеце з пазіцыі новых тэхналогій?

— Дысцыпліна называецца "Дызайн кнігі". Мы даём студэнту ўяўленне пра кнігу як пра структуру. Тэхналогія ў дадзеным выпадку — рэч другасная. На добрым абсталяванні ці кепскім, на камп'ютары ці ўручную мастак мусіць зрабіць нешта, што можна будзе назваць творам. А тое, што макетаванне ажыццяўляецца на камп'ютары, гэта натуральна. Было б нелагічна ігнараваць сучасныя тэхналогіі.

— Я неаднойчы бачыў творы вашых студэнтаў, надрукаваныя ў адным асобніку. А ці можна перавесці такія кнігі ў наклад?

— Тэарэтычна, так. На справе — цяжэй. Усе гэтыя кнігі зроблены з улікам рэчаіснасці. Гэта вучэбныя праекты, арыентаваныя на звыклыя нам паліграфічныя тэхналогіі. Іншая справа, што там шмат ручной працы. Хутчэй за ўсё, атрымаецца дарагая кніга. Зразумела, што арыгінальныя знаходкі, творчыя эксперыменты не надта стасуюцца з тэхналогіяй вытворчасці сярэдняга класа, арыентаванай на вялікія наклады. Таму для кніг, якія распрацоўваюцца ў якасці вучэбных праектаў, патрэбны друкарні, дзе працуюць з унікальнай кнігай.

— А такая вытворчасць прыбытковая?

— Мяркую, так. Кніга, якая ад нараджэння з'яўляецца рарытэтам, бо ейны наклад — мізэрны, а мастацкая каштоўнасць — вялікая, мусіць знайсці бібліяфіла-калекцыянера, які пагодзіцца заплаціць за яе добрыя грошы і такім чынам кампенсаваць выдавецкія выдаткі. Выдавецтва "Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі" часам робіць настолькі шыкоўныя фаліянты! Тэхналогія дазваляе. Кнігі ж, пра якія мы гаворым, не выдаць вялікім накладам. А ў сённяшніх умовах дзеля малога друкарні, выдавецтву рупіцца няма сэнсу…

— А ці не атрымаецца так, што студэнт у Акадэміі рабіў унікальныя кнігі, а потым атрымаў дыплом, пайшоў на працу, а там ягоная кваліфікацыя нікому не патрэбная?..

— Жыццёвая сітуацыя, у якую трапляе творчая асоба пасля заканчэння навучання. Калі сёння наш выпускнік прыйдзе працаваць у сярэднюю паводле тэхналогіі і статуса друкарню, дык многае тое, чаму ён навучыўся ў Акадэміі і да чаго імкнуўся, будзе незапатрабаваным. Я мяркую, што такой сітуацыі не трэба баяцца: гэта нармальна. Акадэмія рыхтуе прафесіяналаў для элітарнай працы. А ўжо здолее наш выпускнік знайсці ці наладзіць працу, што адпавядае яго кваліфікацыі ды памкненням? Трэба яшчэ валодаць валявым характарам!

— Ці шмат студэнтаў засвоілі курс, што вы выкладаеце?

— Сістэма падрыхтоўкі спецыялістаў у БДАМ наладжана добра, і не дзіва, што нашы выпускнікі, у тым ліку тыя, што працуюць у галіне кніжнага мастацтва, калі-нікалі бываюць заўважанымі ды адзначанымі. Але ў дызайнераў кнігі ёсць свая спецыфіка. Скажам, для іх дысцыпліна пад назвай "Праектная графіка" мусіць быць скіравана ў паліграфію.

І яшчэ. Мы маем добрыя традыцыі кніжнага мастацтва, але навучання па згаданым профілі ў нас не было. Не было такога, каб вучылі разглядаць кнігу як мастацкі комплекс. Ніхто за ўсю гісторыю нашай краіны не рыхтаваў такіх спецыялістаў.

— А адкуль жа яны браліся? Кнігі ж з друку выходзілі, значыць, нехта іх праектаваў, рабіў макеты выданняў, афармляў…

— Гэта былі спецыялісты-самавукі: самі да ўсяго сваім розумам даходзілі ў часе працы. Альбо прыязджалі з Маскоўскага ці Львоўскага паліграфічных інстытутаў. У нас, праўда, з'явіліся свае тэхналагі паліграфіі, ужо рыхтуем рэдактараў, нават мастацкіх. А вось дызайнераў кнігі — творцаў, якія бачаць кнігу як комплекс, як цэласную сістэму, дзе ўлічана ўсё, нават пах паперы, — не. Я назваў бы іх генеральнымі праекціроўшчыкамі кнігі. А мы ў Акадэміі гэтую справу распачалі, няхай не ў тым аб'ёме, не ў тым маштабе, як хацелася б.

— А як даўно ў БДАМ пачалі рабіць кніжныя дыпломы?

— З 2005-га такая практыка існуе як сістэма. Дагэтуль дыпломнікі да праектавання кнігі звярталіся спарадычна.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ
Фота аўтара

Экспедыцыя па традыцыі

Пілігрымка-фольк

Палессе — край, багаты на святы і абрады, песні, легенды, паданні. Часткова тэрыторыя Лельчыцкага раёна, якая адносіцца да Прыпяцкага запаведніка, не з'яўляецца выключэннем.

Таму невыпадкова, што спецыялісты Гомельскага абласнога цэнтра народнай творчасці, РМЦ аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Лельчыцкага райвыканкама ўдзельнічалі ў фальклорнай экспедыцыі па вёсках ды пасёлках Прыпяцкага запаведніка — Данілевічы, Сіманіцкі Млынок, Слабада і Салагубаў — з мэтай распрацоўкі найбольш верагоднай версіі бытавання старажытных народных святаў і абрадаў, песень, легенд, паданняў, якіх у ходзе фальклорнай пілігрымкі была сабрана нямала.

Дарэчы, такая экспедыцыя, што адбываецца ў рамках вывучэння фальклору Прыпяцкага запаведніка, — ужо трэцяя па ліку. Раней яны праходзілі па вёсках і пасёлках Жыткавіцкага і, часткова, Петрыкаўскага раёнаў Гомельскай вобласці.

Людміла МЕЛЬНІКАВА, вядучы метадыст па народных традыцыях і абрадах Гомельскага АЦНТ
Фота Ірыны ГЛУШЭЦ, метадыста па этнаграфіі і фальклору Гомельскага АЦНТ

Дыпломнікі

Сёння мы публікуем вытрымкі з дыплома выпускніцы БДУКіМ Ірыны ТАЛЬКОЎСКАЙ. Яго тэма: "Маркетынгавы патэнцыял інавацыйных каналаў медыяпаведамленняў (на матэрыяле нетрадыцыйных рэкламных носьбітаў — Ambient Media, якія атрымалі развіццё ў Беларусі)". Праца — практыкаарыентаваная і ўтрымлівае, як падаецца, шмат ідэй, звязаных з рэкламнай дзейнасцю ўстаноў культуры, у тым ліку сельскіх.

Ірына ТАЛЬКОЎСКАЯ, выпускніца кафедры менеджменту сацыякультурнай дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў

А рэклама этна-фестывалю — арт-аб'ект у шкляным кубе

А вось вам і ідэя!

А ідэя наступная: правесці Фестываль традыцыйнай беларускай культуры "Самабытнасць". Маркетынгавы план праекта такі: прасоўванне падзеі ў Інтэрнэце. Для гэтага ствараюцца тэматычныя групы ў сацыяльных сетках, пачынаецца абмеркаванне на форумах ды інфармацыйна-даведачных парталах… Інфармацыя пра фэст будзе размешчана ў начных клубах, дзе выступаюць фольк-гурты, у мастацкіх галерэях і салонах-крамах, даведзена да турыстычных агенцтваў, традыцыйных СМІ. Але мяркуецца выкарыстанне і Ambient Media. Носьбіты падбіраюцца такім чынам, каб і нацыянальны каларыт перадаць, і застацца нестандартным. Перавага аддаецца арт-аб'ектам — скульптурам з саломкі, керамікі, дрэва. Гэтыя творы мастацтва ў шкляных кубах будуць вылучацца на фоне гарадскога асяроддзя і пэўным чынам эстэтызаваць яго.

Выцінанка-ambient

Нестандартная рэклама

Традыцыйная рэклама стамляе, надакучвае. А Ambient Media — нетрадыцыйны маркетынг, які ўздзейнічае на спажыўца нечакана. Гэта своеасаблівая альтэрнатыва вонкавай рэкламе. Ambient Media — нестандартныя носьбіты рэкламы, малабюджэтныя, нізкатэхналагічныя, але суперэфектыўныя.

Прыклады канца XVIII — пачатку XIX стагоддзя: у Англіі — людзі-"сэндвічы", конныя рэкламныя працэсіі, расфарбоўванне тратуараў, рэклама ў рэстаранных меню; у Германіі — акцыі "Маладая дама, якой гэты абутак прыйдзецца па назе, атрымае яго ў падарунак", жывыя звяры ў заалагічнай краме… Адзін з самых арыгінальных праектаў XX стагоддзя ў ЗША: скідванне цукерак на мініяцюрных парашутах над сарака гарадамі. У выніку цукеркі прадаваліся па пяць мільёнаў штук за дзень.

Немалаважная акалічнасць: правакацыйны маркетынг уключае два асноўныя блокі — саму інтрыгу (доўжыцца пару месяцаў) і яе выкрыццё.

Вось некалькі цікавых кірункаў Ambient Media:

Animal Ad — размяшчэнне рэкламы на жывёлах;

People Ad — на спецыяльных панэлях, што носіць супрацоўнік;

Airfield Ad — на палях ля аэрапортаў;

Graffiti (Stencils) — трафарэтграфіці;

Creative Direct Mail — крэатыўнае паштовае ліставанне;

Brand Space — месца камунікацыі брэнда са спажыўцом;

Flying Banner — банер, які лятае;

Stickering — расклейка брэндзіраванага скотча;

Underwater Ad — размяшчэнне на дне басейнаў;

Unknown City Object — гарадскія інсталяцыі;

Wild Posting — стыкер-кампанія...

А што ў нас?

Рэкламны рынак Беларусі прадстаўлены збольшага традыцыйнымі медыя: вонкавай рэкламай, рэкламай у прэсе, на тэлебачанні і радыё. Дамінуе тэлебачанне. Эфектыўным медыяканалам застаецца Інтэрнэт. Але відавочна, што рэкламны рынак нашай краіны мае патрэбу ў мадэрнізацыі, кваліфікаваных спецыялістах і ўвазе з боку дзяржавы…

Прыкладам Ambient Media можна назваць рэкламу (арт-аб'ект), размешчаную на лесвіцы аднаго з мінскіх аўтацэнтраў. Падаецца, на ёй стаіць легкавік, а гэта — добра выкананая ілюзія: карціна ў фармаце 3D. Выкарыстанне АМ-рэкламы ў нас носіць разавы характар, але рэкламадаўцы пачынаюць усведамляць той факт, што менавіта такая рэклама — найбольш эфектыўная.

І самае цікавае: Ambient Media — не капіруецца! Нельга скарыстацца паспяховым вопытам канкурэнта ды правесці па аналогіі ўласную рэкламную кампанію, нават з дадаткам нейкіх сваіх малаістотных ідэй.

Нестандартнасць акцый уключыць "сарафаннае радыё"…

Асноўным рэкламным аб'ектам будзе выцінанка, а носьбітамі — вітрыны, аконнае шкло, прыпынкі грамадскага транспарту.

Дыплом чытаў Яўген РАГІН

На здымках: варыянты ambient-рэкламы, якія можна ўвасобіць у кожнай установе культуры (3D-малюнак на прыступках, стыльная афарбоўка вонкавых канструкцый або арыгінальная форма газонаў ля ўваходу).

Рэйтынг ідэй з інтэрнэт-прасторы

Літаратар у сацыяльнай сетцы. Але не наш...

Большасць школьнікаў ці не ўвесь вольны час праводзіць у Інтэрнэце: у сацыяльных сетках. Падлеткі ўсё менш і менш звяртаюцца да кнігі як сродку адпачынку і радзей наведваюць бібліятэкі. Таму дзіцячыя бібліятэкі Мінска вырашылі самі прыйсці да сваіх чытачоў і быць там, дзе школьнікі бавяць свой вольны час. У адной з сацыяльных сетак амаль кожная мінская дзіцячая бібліятэка мае сваю старонку.

Магчымасці тут вялікія. Па-першае, можна прапанаваць сяброўства неабмежаванай колькасці людзей і расказаць ім пра бібліятэку — гэта бясплатная і якасная рэклама. Па-другое, на сваёй старонцы можна змяшчаць навіны кнігавыдання, ствараць рэйтынгі самых цікавых (або нецікавых) кніг, распавядаць займальныя гісторыі з жыцця пісьменнікаў, ладзіць віртуальныя кніжныя выстаўкі, змяшчаць анатацыі ды спісы новых кніг, вывешваць аб'явы з запрашэннямі на мерапрыемствы... Па-трэцяе, весці дыялог са сваімі чытачамі…

Часцяком на старонках мінскіх дзіцячых бібліятэк з'яўляюцца і справаздачы аб праведзеных мерапрыемствах: некалькі сказаў ды фота. Наогул, дзейнасць бібліятэк у Інтэрнэце не застаецца па-за ўвагай падлеткаў ды іхніх бацькоў. Колькасць віртуальных сяброў стала расце, а з імі — і колькасць рэальных чытачоў.

Другі кірунак работы бібліятэк у сацсетках — гэта стасункі з калегамі з іншых гарадоў ды краін. Па ім актыўна працуе Дзіцячая бібліятэка № 8 г. Мінска. Так, пры дапамозе сацыяльнай сеткі бібліятэка арганізавала сумесную акцыю з Дзіцячай бібліятэкай № 8 г. Санкт-Пецярбурга па абмене паштоўкамі паміж чытачамі. У Мінску і Пецярбургу прайшлі мерапрыемствы са школьнікамі 3 — 5 класаў, дзе ім расказалі пра сусветны рух — посткросінг ды прапанавалі абмяняцца паштоўкамі са сваімі аднагодкамі з іншай краіны. Дзеці напісалі пра свае захапленні, любімыя кнігі, для зваротнай сувязі змясцілі хатнія адрасы. Потым бібліятэкары заказным лістом адправілі паштоўкі на адрас другой бібліятэкі —удзельніцы акцыі. Калі паштоўкі былі атрыманы, правялі другое мерапрыемства, пад час якога распавялі школьнікам пра Санкт-Пецярбург, паказалі фота дзяцей і раздалі атрыманыя паштоўкі. У Санкт-Пецярбургу зрабілі тое ж самае. Многія дзеці ўпершыню адпраўлялі і атрымлівалі папяровую паштоўку.

Акрамя бібліятэк, у сетцы свае старонкі актыўна размяшчаюць і пісьменнікі, часцей, на жаль, не нашы, а — расійскія. Бібліятэка на сваёй старонцы можа змясціць спасылку на старонку аўтара ці яго групу. А можа дамовіцца з творцам ды арганізаваць он-лайн-сустрэчу з ім, што і зрабіла Мінская дзіцячая бібліятэка № 8.

Чытачы бібліятэкі мелі магчымасць сустрэцца са знакамітай расійскай дзіцячай пісьменніцай Кацяй Мацюшкінай. На он-лайн-сустрэчу пісьменніца прыйшла не адна, а са сваім кніжным героем — Катом да Вінчы. Яна распавяла пра свае кнігі, а потым прапанавала дзецям задаваць ёй пытанні. Калі сустрэча скончылася і адключылі вэб-камеру, дзеці кінуліся да стэлажа, дзе стаялі кнігі Мацюшкінай. На жаль, іх было няшмат (разабралі чытачы).

Апошнім часам папулярнасць набылі міжнародныя акцыі. Праз сацыяльныя сеткі бібліятэкі розных краін (часцей за ўсё Беларусі, Расіі, Украіны) дамаўляюцца аб правядзенні чытанняў твораў, прысвечаных пэўным падзеям. У адзін і той жа час у больш як сотні бібліятэк праходзяць аднолькавыя мерапрыемствы, фотаздымкі з якіх потым размяшчаюцца ў сетцы...

Марына ПЕТРАШКЕВІЧ,
бібліятэкар Дзіцячай бібліятэкі № 8
Мінск

Архіўны фонд

Сёння матэрыялы прадастаўлены Нацыянальным гістарычным архівам Рэспублікі Беларусь. Дзякуючы старонцы ў сацыяльнай сетцы ўсё больш людзей можа пабачыць унікальныя дакументы, дакрануцца да мінуўшчыны. Дарэчы, сама ўстанова акурат сёлета адзначае 75-годдзе з часу заснавання! Віншуем і жадаем цікавых знаходак! Пакуль жа — частка цікавых дакументаў, што прадаставіў архіў для публікацыі на старонках газеты "Культура".

3.

"Фэйсбук" Жыгімонта II



4.

Нацыянальны гістарычны архіў **упершыню паказаў унікальныя дакументы**



1.



5.



2.

1. Гродзенскі земскі суд. Канцылярскі служка занудзіўся перапісваць аднастайныя тэксты і вырашыў намаляваць у актавай кнізе караля Жыгімонта II Аўгуста і кіеўскага праваслаўнага мітрапаліта. "Facebook" XVI стагоддзя. 1556 г.

2. Патэнт, выдадзены магістратам аўстрыйскага горада Грос-Каморн (сучасны Камарна ў Славакіі) кавальскіх спраў майстру Андэрсу Шперлінгу, які напрыканцы XVIII ст. прыехаў у Віцебск. 1781 г.

3. Касцельны служка зарысаваў на старонках кнігі абрад хрышчэння. Такой была пінская шляхта 250 гадоў таму. Пінск, сярэдзіна XVIII ст.

4. Дарчы ліст Дашкі Яцкавіча Храбтовіча царкве Прасвятой Багародзіцы Лаўрышаўскага манастыра на двух падданых у Шчорсах. Скорапіс на пергаміне. 1488 г.

5. Уласнаручны подпіс Льва Сапегі. Год — пасля сыходу з пасады вялікага канцлера, год — да заступлення на пасаду вялікага гетмана. 1624 г.

З працягам

Забойства Пэна: яшчэ адна версія злачынства

(Працяг. Пачатак у №№ 26, 28 — 31.)

...Слова — Раману Файнштэйну і ягонай сястры Яніне Цомік-Файнштэйн: "...1985 год: першыя, яшчэ нясмелыя, крокі гарбачоўскай "перабудовы". Адна з яе праяў — дазвол на стварэнне грамадскіх аб'яднанняў па інтарэсах. Так, у красавіку гэтага года распачаў працу краязнаўчы клуб Віцебскай абласной бібліятэкі імя Леніна. <...> Сярод мерапрыемстваў 1987-га быў запланаваны вечар, прысвечаны памяці віцебскага мастака Ю.М. Пэна (1854 — 1937 гг.): у лютым спаўнялася 50 гадоў з дня яго смерці. Мы, як і многія іншыя віцябчане, гэтае мерапрыемства чакалі з асаблівай цікавасцю. Імя заснавальніка Віцебскай мастацкай школы і першага настаўніка Марка Шагала было добра знаёмае кожнаму патомнаму віцябчаніну, хаця ў пасляваенныя гады публічна пра яго неяк не згадвалася наогул. Стваралася ўражанне, што нехта спецыяльна спрабуе выкрасліць гэтага першакласнага партрэтыста з гісторыі беларускага мастацтва...

У той дзень невялікая зала аддзела беларускай літаратуры была забіта наколькі магчыма, вельмі многія нават стаялі. <...> З расповедам пра творчасць Юрыя Міхайлавіча выступілі дацэнт Віцебскага медыцынскага інстытута Мая Мядзведзева і выкладчык педінстытута Аляксандр Лісаў. <...> Успамінамі пра свайго першага настаўніка падзяліўся вядомы віцебскі мастак Ісак Бароўскі (1921 — 1991 гг.). У выступленнях некалькі разоў гаварылася пра тое, што загінуў мастак трагічна: быў забіты сякерай пры таямнічых абставінах ва ўласнай кватэры. Забойцамі Юрыя Міхайлавіча абвясцілі яго сваякоў. Аднак у выступленні І.Бароўскага і вядучага гэтага вечара Аркадзя Падліпскага выказваліся вялікія сумневы ў правільнасці афіцыйнай версіі. <...> Прыйшоўшы дадому, мы падзяліліся з бацькамі ўражаннямі аб пачутым у бібліятэцы. Калі зайшла гаворка пра забойства мастака, нашы бацька і маці спачатку недвухсэнсава пераглянуліся, а потым і прызналіся: мы, Файнштэйны, і ёсць тыя самыя сваякі мастака, якіх паўстагоддзя таму абвінавацілі ў забойстве Юрыя Міхайлавіча і асудзілі за яго. Гэтае паведамленне прагучала для нас як гром сярод яснага неба...".

Ю.Пэн. "За газетай".

Успаміны, урывак з якіх прыведзены, заканчваюцца фразай: "Ніхто з Файнштэйнаў ніколі не прызнаваў сябе вінаватым у забойстве Ю.Пэна. Ніхто з іх да гэтага часу не рэабілітаваны".

Цяпер, калі дакладна вядома, што родныя мастака і на самой справе не вінаваты ў забойстве, ці не прыйшоў час хаця б пасмяротна рэабілітаваць нявінных людзей? З такой просьбай Праўленне Віцебскага краязнаўчага фонду імя А.Сапунова звярнулася ў Віцебскую абласную пракуратуру ў 2004 годзе. Вось які адказ быў атрыманы: "Ваш зварот, у якім Вы ставіце пытанне аб рэабілітацыі сваякоў мастака Ю.М. Пэна ў сувязі з іх незаконным асуджэннем у 1937 годзе за забойства апошняга, пракуратурай вобласці разгледжаны з вывучэннем матэрыялаў крымінальнай справы. Устаноўлена, што прысудам судовай калегіі па крымінальных справах Вярхоўнага Суда БССР ад 22.04.1937 года Файнштэйн Лея Гіршаўна, Файнштэйн Абрам Рувімавіч, Файнштэйн Неха Рувімаўна, Файнштэйн Рувім Залманавіч, Файнштэйн Залман Рувімавіч, Файнштэйн Рыва Рувімаўна прызнаны вінаватымі ў бандытызме. Вызначэннем судовай калегіі па крымінальных справах Вярхоўнага Суда СССР ад 16.10.1938 года прысуд Вярхоўнага Суда БССР зменены, дзеянні Файнштэйнаў Абрама і Нехі перакваліфікаваны на артыкул 247 (разбой) КК БССР, Леі, Рувіма, Залмана і Рывы на артыкул 25 (падбухторванне) артыкула 247 КК БССР, у астатняй частцы прысуд пакінуты без змяненняў. *Вывучэннем матэрыялаў крымінальнай справы факт забойства асуджанымі Файнштэйнамі мастака Пэна Ю.М. пацверджаны* (вылучана мной. — **А.П.**). У сувязі з тым, што апошнія асуджаны за здзяйсненне агульнакрымінальнага злачынства, парадак перагляду спраў і прыняцця рашэнняў устаноўлены Пастановай Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 06.06.1991 года "Аб парадку рэабілітацыі ахвяр палітычных рэпрэсій 20-х — 80-х гадоў" на іх не распаўсюджваецца. Пры такіх абставінах падстаў для апратэставання судовых рашэнняў, якія адбыліся па справе, не маецца".

Дзіўна, але, ведаючы, якімі метадамі здабываліся гэтыя паказанні ў 1937 годзе, пракурорскія работнікі не бачаць ці проста не жадаюць бачыць, што "Справа Файнштэйнаў" шыта белымі ніткамі. Адзначу, у заключэнне адказу мяне інфармуюць, што "ў выпадку нязгоды з прынятым рашэннем Вы маеце права яго абскардзіць у вышэйстаячага пракурора". Каюся: абскарджваць не стаў...

(Працяг будзе.)

Аркадзь ПАДЛІПСКІ
Віцебск



Ю.Фалат. "Аўтапартрэт". 1903 г.

Юліян Фалат і яго Беларусь

(Працяг. Пачатак у № 31.)

…Зразумела, Фалат ехаў у якасці жывога "летапісца". Дабраліся да Баранавіч па чыгунцы ў асабістым вагоне наследніка германскага прастола. На станцыі да іх далучыўся далёкі сваяк Антонія Радзівіла — князь Мацей Ёзаф Радзівіл, уладальнік вялікага маёнтка і вёскі Паланечка, што за 35 вёрст ад Баранавіч, дзе ў пачатку XIX стагоддзя камергер імператарскага двара, князь Канстанцін Радзівіл пабудаваў ампірны палац з цэглы, у якім размяшчаліся шыкоўная бібліятэка, архіў ды мастацкая галерэя. А яшчэ раней тут у гасцях у Караля Станіслава Радзівіла (так-так, таго самага "Пане Каханку") нават пабываў яго блізкі сябра — аўтар "Недоросля", драматург Дзяніс Фанвізін. Легенда апавядае, што пасля багатага балявання абодва яны паспяхова "палявалі" на мясцовых прыгажунь, а не толькі на звяр'ё ды качак…

Любіў Паланечку і знакаміты паэт Уладзіслаў Сыракомля, які пакінуў добрыя ўспаміны пра гэтае мястэчка. У сваім дзённіку ён запісаў: "…Калі з Міра ехаць па вуліцы Жухавіцкай, то далей мы прыбылі б у цудоўную Паланечку — уладанне князя Канстанціна Радзівіла, дзе пабачылі б дзіўны сад, прыгожы ды цікавы ў многіх адносінах палац. Сустрэўшыся ж з гаспадаром, лёгка ўпэўніцца ў знакамітай радзівілаўскай гасціннасці…"

Але ўсё гэта было раней. А пакуль уся паляўнічая кампанія тут жа, на станцыі "Баранавічы", перасела ў шыкоўныя сані, накрытыя мядзведжымі шкурамі, і пачала свой шлях па радзівілаўскіх уладаннях. Фалат піша: "…Маленькая, засыпаная снегам "станцыйка", характэрная для рускіх чыгунак, заснежаныя дрэвы і штыкетнік — усё асветлена бруднавата-жоўтым святлом некалькіх ліхтароў: гэта маё першае ўражанне. Снег рыпіць пад нагамі, траскучы мароз — гэта іншы свет, іншая зіма, чым тая, якую я бачыў дагэтуль… Яшчэ сапраўдная ноч, і мізэрныя хаткі мястэчка спяць. Усё патанае ў цёмна-блакітным, месцамі зеленаватым, колеры, з якога выяўляюцца яшчэ больш цёмныя сцены дамкоў, міма якіх праязджаем. Ад іх адбіваецца энергічны голас званочка нашых саней. Пасля некалькіх паваротаў, скіраванне якіх вызначае абвіслы тэлеграфны дрот, апынаемся ў чыстым полі. Што за ноч, што за зіма! Дрэвы, пакрытыя сінім інеем, — нібы ледзяныя скалы, вусцішныя і нейкія дзікаватыя..."

Так маляўніча Фалат апісвае пачатак першага дня паляўнічых прыгод. Сапраўды, ехалі ў дваццаціградусны мароз па дзікай глухамані. Наўкол — ні душы, адно лес ды тоўсты слой чыстага снегу са слядамі лап звяр'я і птушак. Дарогу можна было знайсці толькі па бярозах, якія раслі па яе баках. Пасля кароткага прыпынку ў маёнтку Радзівілімонты паляўнічыя скіраваліся ў старадаўнюю, вядомую з XV стагоддзя, вёску Дзяніскавічы (цяпер — Ганцавіцкі раён Брэсцкай вобласці) і спыніліся ў простым драўляным паляўнічым дамку. Адтуль Вільгельм ды Радзівілы са світай скіраваліся ў палескія пушчы…

Фалат піша: "…Узвышшы і нізіны аб'язджалі так званай зімовай дарогай, што вядзе напрасткі праз замёрзлыя азёры ды ручаі — аж да вялікай вёскі Астраўчыцы, якая з'яўляецца варотамі ляснога краю. Дасягнулі, нарэшце, лясоў і лясной глушы, натыкаемся на цэлыя абозы паляўнічых саней і на вялікую колькасць загоншчыкаў, якія сагараюцца каля незлічоных вогнішчаў. Хутка поўдзень, такім чынам, не губляючы часу, займаем пазіцыі на паляўнічай дзялянцы. Я далучаюся да выбранай групы, якая ўключае акрамя прынца Вільгельма стралкоў пана Абламовіча і мяне. Прынц стаіць на сцежцы мядзведзя, праз нейкія восемдзясят метраў злева — князь Антоній Радзівіл, а справа, на такой жа адлегласці, — князь Мацей.

Нечакана з глыбіні лесу пачуліся гукі труб і стрэлы, якія былі прызначаны для спалоху мядзведзя. На пазіцыі ўсталявалася цішыня чакання. Раптам справа, з пазіцыі князя Мацея, грыміць стрэл. Потым загукала паляўнічая труба: "Мядзведзь!", — што азначала канец паляўніцтва. На твары пруска-га прынца — прыкметнае здзіўленне, да якога, відаць, далучаецца і пан Абламовіч — распарадчык паляўніцтва. Паколькі сігнал паўтараецца, мы пакідаем пазіцыі і накіроўваемся туды, дзе ляжыць забіты мядзведзь. Па дарозе хачу сёе-тое даведацца ў князя Мацея. Ён, злёгку прыцішыўшы крок, прызнае: "Зайграла радзівілаўская кроў, і я не вытрымаў…" Гэтым ён растлумачыў абсурднасць свайго стрэлу, якім пазбавіў прынца прыемнасці першым забіць мядзведзя. Разам з князем Антоніем і прынцам разглядваем забітае, па сутнасці, мядзведзяня. На шчасце, яно — невялічкае і несамавітае. Гэта дае магчымасць князю Мацею знайсці выйсце з сітуацыі і вымавіць: "Ваша Высокасць, маленькі мядзведзь — для мяне, а вялікі — для Вашай Высокасці". Так знаходлівы князь нейкім чынам згладзіў сітуацыю, а ўсе прысутныя пачалі навыперадкі зніжаць каштоўнасць мядзведзя, маўляў, ён увогуле не варты ніякай увагі. На вачах прысутных твары гаспадара і прынца святлеюць, тым больш, што егер Дамінік абяцае некалькі вялізных, проста неверагодных мядзведзяў…"

Уявіце сабе: Фалат — без стрэльбы, толькі з альбомам ды алоўкамі. Канешне ж, тварыць на такім марозе не вельмі ўтульна, але мастаку не прывыкаць: ён ужо раней неаднойчы трапляў у падобныя пераплёты і ў Беларусі, і на Украіне, і ў Германіі. Справа ў тым, што нямецкі прынц прывык да таго, што на ўсіх паляваннях яму давалі магчымасць зрабіць галоўны стрэл. І якім жа было яго здзіўленне, як піша мастак, калі пасля таго, як у поле зроку паляўнічых трапіў мядзведзь, яго вокамгненна ўлажыў снайперскім стрэлам князь Мацей Радзівіл! Настрой высокага госця, як вы разумееце, мусіў быць сапсаваны, але Мацей сам выправіў гэтае далікатнае становішча. Ён развёў рукамі, сказаўшы, што такі сціплы ды несамавіты мядзведзь не заслугоўвае стрэлу Яго Высокасці, ды папрасіў пабераргчы патроны для больш буйнога звера. І, сапраўды, на гэтым паляванні прынц Вільгельм здабыў двух буйных і аднаго невялічкага мядзведзяў, аднаго лася, а двух мядзведзянят потым павёз у Германію жывымі…

Гэта было, аднак, толькі пачаткам, першым днём палявання. А доўжылася яно амаль месяц, так што трафеі былі буйныя. Прынцу ўдалося зваліць яшчэ трох вялікіх мядзведзяў. А ўсяго ў выніку было забіта дзевятнаццаць старых мядзведзяў і чатыры маладыя. Хтосьці з сучаснікаў падлічыў, што гэта было апошняе паляванне, якое знакамітыя паляўнічыя арганізавалі з сапраўдным радзівілаўскім размахам…

Практычна ўвесь 1886 год Фалат правёў у Беларусі і яшчэ неаднойчы прымаў удзел у падобных паляўнічых "акцыях". Вынікам такога баўлення часу для яго з'явілася вялікая серыя кампазіцый, напісаных пазней па натурных накідах алеем і акварэллю. Найбольш цікавыя з гэтых твораў — "Паляўніцтва", "Шашні паляўнічага", "Паляванне на мядзведзя", "Сустрэча пана", "Пагоня за мядзведзем", "Вяртанне з мядзведзем", "Запрашэнне на паляванне"…

Зразумела, што такое паляванне збірала вялікую колькасць егераў і сялян, якія залучаліся для загону звера. Мастак прасякнуўся павагай да гэтых людзей і стварыў шмат іхніх партрэтаў ды кампазіцый, дзе галоўным персанажам выступае менавіта беларускі селянін.

У акварэлі "На паляванне" адлюстравана вялікая група паляўнічых, якія сабраліся на ўзлеску перад выхадам на промысел. Барвовае сонца асвятляе твары і фігуры людзей. На снезе — доўгія блакітныя цені. Ва ўсім каларыстычным і пластычным рашэнні адчуваецца напружанае чаканне. Цудоўна паказаны беларускі пейзаж: стройныя хвоі стаяць роўнымі радамі, на іх ствалах адбіліся залацістыя прамяні сонца… Таксама таленавіта ды пераканаўча створана шматфігурная карціна "Прывал паляўнічых": велізарны атрад паляўнічых на санях у лесе спыніўся на адпачынак. Злева гарыць вялікае вогнішча, а ў цэнтры і справа палатна — людзі ў жвавых позах…

А як цікава ў акварэлі "Засада" мастак перадаў псіхалагічны стан паляўнічых, якія прытаіліся ў засадзе ў чаканні звера! Яны стаяць па калена ў снезе з рагацінамі… Ці — работа "Са здабычай": скрозь завіруху паляўнічыя з цяжкасцю цягнуць на плячах вялізнага мядзведзя. Злева, на першым плане, — чалавек з рагацінай. Ён ужо амаль знясілены, але мужна пракладвае шлях сваім таварышам. А якія выразныя тыпажы двух паляўнічых беларусаў у кампазіцыі "На мядзведзя"! Што і казаць, ахвота горш няволі…

У вопісе маёмасці замка Радзівілаў ад 6 кастрычніка 1939 года, што захоўваецца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, сказана: "…Асаблівае месца тут займае мастак Фалат, якому ў замку дазволена мець пакой, дзе размешчаны дваццаць яго твораў з адлюстраваннем сцэн палявання і тыпаў паляўнічых. Работы выкананы акварэллю, гуашшу і алоўкам. Шэраг гравюр, малюнкаў алоўкам, пяром, акварэлей і літаграфій зроблены з вялікім майстэрствам…"

(Працяг будзе.)

Барыс КРЭПАК

"Бог цябе сюды паслаў — любі Нясвіж, як Нясвіж цябе палюбіў…"



Ю.Фалат. "Возера Свіцязь". 1888 г.

Уявіце сабе: Фалат — без стрэльбы, толькі з альбомам ды алоўкамі. Канешне ж, тварыць на такім марозе не вельмі ўтульна, але мастаку не прывыкаць...

КУЛЬТУРА

а·ф·і·ш·а «К»

З 10 ЖНІЎНЯ — ДА 17 ЖНІЎНЯ

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:
■ Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.
■ Мастацтва Беларусі XIX — пач. XX стст.
■ Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.
■ Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.
■ Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.

Выстаўкі:
■ **"Партрэты ўладароў і магнатаў Вялікага Княства Літоўскага"** (з музеяў Львова і Луцка) — да 26 жніўня.
■ **"Тры іконы са збораў найбуйнейшых музеяў Беларусі"** — да 28 жніўня.
■ **"Слуцкія паясы"** (са збору Львоўскага гістарычнага музея) — да 18 красавіка 2014 г.
■ **"З мінулага ў будучыню"** — да 26 жніўня.
■ **"Струны прасторы і часу"** (жывапіс Уладзіміра Пракапцова) — да 15 жніўня.

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь:

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І-й ПАЛОВЫ XIX ст."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а.
Тэл.: 327 88 78.
■ Пастаянныя экспазіцыі: **"Парадныя залы", "Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча", "Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст."**.
■ Выстаўка адной карціны Адама Шэмеша **"Партрэт Людвіка Кандратовіча (Уладзіслава Сыракомлі). 1854"** (са збору Літоўскага мастацкага музея).
■ **"Аўтапартрэт"** Валенція Ваньковіча.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён.
Тэл.: 507 44 68.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстаўка В.Паўленка **"Той абрус, што мама вязала"**.

МУЗЕЙ В.К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ Ў Г. МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37.
Тэл.: (8–0222) 22 48 87.

■ Экспазіцыя **"Культура 1-й пал. XIX ст."**.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 327 43 22.

Экспазіцыі:
■ **"Старажытная Беларусь"**.
■ **"Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы"**.
■ **"Водбліскі ваеннай славы"**.
■ **"Мастацтва ў гарадской культуры XIX — пач. XX стст."**.

Выстаўкі:
■ **"У промнях веры хрысціянскай"**.
■ **"Выратаваныя каштоўнасці"** (сумесна з філіялам Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея — Музеем "Выратаваныя мастацкія каштоўнасці"). — да 15 верасня.
■ **"Скарбы Беларусі"**.
■ **"Камунальная кватэра"**.
■ **"Пад знакам Меноры. З гісторыі яўрэйства на Беларусі"** (до 90-годдзя дзеючага Прэзідэнта Дзяржавы Ізраіль Шымона Перэса і 100-годдзя з дня нараджэння былога Прэм'ер-міністра Ізраіля Менахема Бегіна).

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДА РСДРП

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а.
Тэл.: 290 68 47.
■ Выстаўка **"Усходні вектар. В'етнам"**.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19. Тэл.: (8–01770) 5 51 81, 5 31 96, 2 06 02

Інфармацыйна-касавы цэнтр:
■ Фотавыстаўка Дзяніса Раманюка **"Беларусь Сінявокая"** — да 31 жніўня.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: (8–01596) 2 82 91, (8–01596) 2 82 70.
Пастаянная экспазіцыя.

Выстаўкі:
■ Фотавыстаўка **"Мір стары — Мір новы"**.
■ Выстаўка **"Навагрaдскі край вачыма Канута Русецкага. З альбома 1844 — 1846 гг."** — да 30 верасня.
■ Выстаўка аўтарскіх лялек **"Малая гасцёўня"** — да 31 верасня.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА



г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5.
Тэл.: 294 91 96.

Экспазіцыі:
■ **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
■ Інтэрактыўная гульня **"Таямніцы дома Песняра"** для ўсіх катэгорый наведвальнікаў.
■ Тэатралізаваныя экскурсіі па казках, апрацаваных Якубам Коласам для школьнікаў малодшага ўзросту.
■ Выстаўка **"Якуб Колас у эміграцыйным друку"**, прысвечаная VI З'езду беларусаў свету — да 17 жніўня.
■ Музейна-педагагічны праект для дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту **"Крочым у школу разам з Коласам"** (заяўкі прымаюцца па телефоне: +375 17 284 17 02).

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4.
Тэл.: 327 78 66.
■ Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце.
■ Цыкл музейна-педагагічных заняткаў з элементамі тэатралізацыі **"Дзядзька Янка, добры дзень!"** для дзяцей малодшага школьнага ўзросту і сямейнага наведвальніка.
■ Інтэрактыўная гульня **"У пошуках папараць-кветкі"** для ўсіх катэгорый наведвальнікаў.
■ Выстаўка **"Былое ў думках ускрашаць..."**, прымеркаваная да 100-годдзя напісання Янкам Купалам рамантычных паэм.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 25а.
Тэл: 226 03 98.

Выстаўкі:
■ **"Партызанскі лагер"**.
■ Выстаўка дзіцячага малюнка **"Я памятаю! Я ганаруся!"**.

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ



г. Гомель, пл. Леніна, 4.
Тэл.: (8-0232) 74 19 11.
Цэнтральная частка палаца

Выстаўкі:
■ Творы **Нікаса Сафронава** — да 8 верасня.
■ Работы Марыі Быкавай **"Цені палацавай эпохі"** — да 15 верасня.
■ Старажытнарускае шыццё XV — XVIII стст. са збораў Разанскага гісторыка-архітэктурнага музея-запаведніка **"Жывапіс іголкай"** — да 6 кастрычніка.
■ Мастацкія творы Анжалікі Шабалтас **"Востраў белых птушак"** — да 22 верасня.
■ Жывапіс У.Кожуха і скульптура С.Бандарэнкі **"Чыстае, светлае, роднае"** — да 8 верасня.
■ Старажытнаруская дружынная культура ў археалагічных артэфактах **"З кап'я ўскормленыя"** — да 31 жніўня.

Экспазіцыі:
■ **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
■ **"Загадкавыя фантазіі мора"** (грот палаца).
■ Экспазіцыя, прысвечаная дзяржаўнаму дзеячу СССР А.Грамыку.
■ **"Чырвоная гасцёўня"**.
■ "Зала ўрачыстых прыёмаў".
■ Экспазіцыя адкрытага захавання археалагічнай калекцыі музея (цокаль паўднёвай галерэі).
■ **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя).

Вежа палаца
Экспазіцыя:
"Уладальнікі Гомельскага маёнтка Румянцавы і Паскевічы".

Выстаўкі:
■ **"Радкі, імёны, лёсы"** (выстаўка літаратуры к. XIX — пач. XX стст. са збору князёў Паскевічаў).
■ **"Класікі беларускага мастацтва"** (выставачна-адукацыйны праект).

Паўночнае крыло палаца
Экспазіцыя:
■ **"Свет звяроў Гомельшчыны"**.

Выстаўкі:
■ Куток жывых экзатычных рэптылій.

Зімовы сад
Свет субтрапічных раслін і жывёл.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА ГОМЕЛЯ



г. Гомель, вул. Пушкіна, 32.
Тэл.: (8-0232) 74-28-23.

Экспазіцыі:
■ Інтэр'еры гарадскога асабняка к. XIX — пач. XX стст.
■ Прагулкі па старым Гомелі.
■ Гісторыя Гомеля ад старажытнасці да пачатку XX ст.

Выстаўкі:
■ Фотаапараты і фотатэхніка XX ст. (каля 100 адзінак, перададзеных у дар Музею гісторыі г. Гомеля Леанідам Пінскім).

ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ РЭЛІГІІ



г. Гродна, вул. Замкавая, 16.
Тэл.: (8-0152) 74 25 13.

Экспазіцыі:
■ **"Рэлігія і культура ў Беларусі"** (ад старажытных часоў да XXI ст. — архаічныя вераванні, хрысціянскія канфесіі, іслам, іудаізм).
■ **"Эпоха. Час. Будынак"** (гісторыя палаца, у якім размешчаны музей, сямейныя традыцыі і каштоўнасці XIX — пач. XX стст.).

Выстаўка:
■ **"Святыні Бацькаўшчыны"** (храмы Беларусі на старых паштоўках).
■ **"Дрэва добрае"** (да 1025-годдзя Хрышчэння Русі).

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5.
Тэл.: (8-0232) 77 60 60.
■ Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
■ Выстаўка тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
■ Выстаўка **"Скрозь агонь баёў"**.
■ На тэрыторыі працуе пнеўматычны ціp.
■ **"Музей крыміналістыкі"**.

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ

г. Ліда, вул. Перамогі, 37а. Тэл.: (8-0154) 53 22 44.
■ Экспазіцыя **"Прырода Лідчыны"**.

Выстаўкі:
■ **"Вядзём пачатак свой ад Гедыміна..."**.
■ **"Прадметы побыту к. XIX — пач. XX стст."**.
■ Выстаўка адной карціны **"Партызаны"**.
■ **"Прывітанне, ранейшая Ліда!"**.
■ **"Музейна-вобразная зала "Хрушчоўка-60"**.
■ Турыстычна-пазнаваўчая праграма **"Праз вякі, праз стагоддзі"** ў Лідскім замку.

ГАЛЕРЭІ

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

г. Мінск, вул. Казлова, 3.
Тэл./факс.: 290 60 10.
■ Выстаўка мёду.

/ УВАГА! /

ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА"

ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ІНДЭКС — 63875
ВЕДАМАСНЫ ІНДЭКС — 638752

АЛЬБОМ РУСЕЦКАГА

А ў Замкавым комплексе "Мір" працягваецца выстаўка "Навагрaдскі край вачыма Канута Русецкага". Экспануюцца творы з унікальнага альбома вядомага мастака 1844 — 1846 гг. Адна з работ — перад вамі: гэта выява замка Радзівілаў у Нясвіжы.

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА
Выдаецца з кастрычніка 1991 года

Заснавальнік — **Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь**

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь

Галоўны рэдактар — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ

Рэдакцыйная калегія:
Лілія АНАНІЧ, Уладзімір АРЛОЎ, Міхаіл БАРАЗНА, Уладзімір ГІЛЕП, Ірына ДРЫГА, Аляксей ДУДАРАЎ, Кацярына ДУЛАВА, Валянцін ЕЛІЗАР'ЕЎ, Міхаіл КАЗІНЕЦ, Віктар КУРАШ, Барыс СВЯТЛОЎ, Святлана СУХАВЕЙ, Міхаіл ФІНБЕРГ, Леанід ШЧАМЯЛЁЎ, Уладзімір ШЧАСНЫ.

Рэдакцыя:

Рэдактары аддзелаў:
Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Канстанцін АНТАНОВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН.

Спецкарэспандэнт: **Пётр ВАСІЛЕЎСКІ.**

Загадчык аддзела фотаілюстрацый — Юрый ІВАНОЎ

Мастацкі рэдактар — Наталля ОВАД

Карэктар — Інга ЗЕЛЬГІС

Адрас рэдакцыі:
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77.
Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх.
Тэлефоны:
(017) 290 22 50,
(017) 286 07 97,
(017) 334 57 23
Тэлефон-факс:
(017) 334 57 41
Рэкламны аддзел:
тэл. (017) 334 57 41

www.kimpress.by
E-mail: kultura@tut.by

Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.

Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.

*Матэрыял на правах рэкламы.

"Культура", 2013.
Індэксы 63875, 638752
Наклад 6 797

Падпісана ў друк 09.08.2013 у 16.30
Замова 3338
Дзяржаўнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/0494179 ад 03.04.2009. пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

Выдавец —
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Культура і мастацтва"
Ліцэнзія на выдавецкую дзейнасць ЛВ №02330/0003879 ад 17 красавіка 2009 г.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77.
Прыёмная: (017) 290 22 50.
Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35

QR-код: